№ 17 (615) 6 мая 2009

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Шчаслівец Хэнлан**

Старонка 3

**Палітбюро-2009: Юры Жадобін**

Старонка 8




**У НУМАРЫ**

**Казулін: Мы паразумеліся з Пазняком**

На саміце «Ўсходняга партнёрства» будуць прысутнічаць прадстаўнікі не толькі ўладаў, але і грамадства: Мілінкевіч з Казуліным, Пазняк, Шушкевіч і Сурвілла. **Старонка 3.**

**Генадзь Бураўкін: «Мой першы натхняльнік — Юля»**

9 траўня ў адной з найзнакаміцейшых беларускіх сем'яў — Юліі і Генадзя Бураўкіных — юбілей: яны разам 50 гадоў. **Старонка 7.**

**Маршруты па Беларусі: Котра**

Рай для байдарыстаў, ягаднае шаленства, былое Дайноўскае княства. Піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 12.**

**Як БТ Зінаіду Бандарэнку павіншавала**

Пад віншаваннем народнай артыстцы, якая аддала тэлебачанню з сорак гадоў, не падпісаўся ніводны кіраўнік Белдзяржтэлерадыёкампаніі. **Старонка 15.**

**У аўтарамонце мяне спрабавалі падмануць на 17 тысяч!**

Пошта Рэдакцыі. **Старонка 10.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер.
На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Лёсы чатырох

7 траўня спаўняецца роўна 10 гадоў з часу знікнення былога міністра ўнутраных справаў Юры Захаранкі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**«Дакладваю аб тым, што…»**

Гэта была першая падобная гучная справа. Потым раптоўна зніклі палітык Віктар Ганчар і бізнесмен Анатоль Красоўскі, яшчэ праз год — тэлеаператар Дзмітры Завадскі. Перад гэтым у красавіку 1999 году пры дзіўным збегу абставінаў загінуў папулярны палітык Генадзь Карпенка.

А сёння справы зніклых не расследаваныя да канца. Не пакараныя людзі, што стаялі за гэтымі забойствамі (напэўна, сёння ўжо можна смела гаварыць менавіта пра забойствы). Целы зніклых не знойдзеныя і сем'і не могуць іх пахаваць паводле хрысціянскіх традыцыяў.

Праўда пра палітычныя забойствы 1990-х была сабраная дзякуючы сумленнасці генералаў МУС і афіцэраў КДБ, якія рызыкавалі свабодай і жыццём, ведучы свае расследаванні. У гэтых гісторыях уражвае і тое, колькі беларусаў з рызыкай для свайго жыцця сумленна расследавалі гэтыя справы. Праз тое гублялі пасады, вымушаныя былі пакідаць краіну, але ў выніку праўда праточвалася. І з яе асобных фрагментаў па крупіцах складваецца мазаіка тых здарэнняў. Яна яшчэ не прыняла свайго канчатковага выгляду, але гэта справа часу.

Найбольш фактаў было сабрана дзякуючы таму, што тагачасныя кіраўнік КДБ Уладзімір Мацкевіч і генпракурор Алег Бажэлка, відавочна, не замяшаныя ў знікненні, далі каманду расследаваць злачынствы. Былі ўтвораныя следчыя групы, якія сталі збіраць факты.

**Працяг на старонцы 4.**

# Пад дыктоўку Еўропы

Аляксандр Лукашэнка не наважыўся паляцець на саміт «Усходняга партнёрства», які пройдзе 7 траўня ў Празе.

Беларускую дэлегацыю ў Чэхіі будуць прадстаўляць першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка і міністр замежных справаў Сяргей Мартынаў.

Такім чынам, Лукашэнка моўчкі падпарадкаваўся волі еўрапейскіх палітыкаў, шмат хто з якіх не хацеў бачыць «апошняга еўрапейскага дыктатара» ў Празе. Напрыклад, міністр замежных справаў Галандыі Максім Ферхаген напярэдадні заявіў: «Паціскание рукі дыктатару — кепскі сігнал. Гэта запрашэнне не Лукашэнку, а Беларусі. Мы спадзяёмся, што ў Мінску зразумеюць гэта і накіруюць у Прагу прэм'ера ці кіраўніка МЗС».

А яшчэ пры канцы красавіка вярхоўны камісар Еўрасаюзу па замежнай палітыцы і палітыцы бяспекі Хаўер Салана выказаў меркаванне, што кіраўнікі Беларусі і Малдовы Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Воронін «вырашаць не прымаць удзелу ў працы саміту». «У мяне такое ўражанне, што яны не прыедуць», — заявіў Х.Салана. У Мінску, запэўніў еўракамісар, цудоўна разумеюць, што з Лукашэнкам, які толькі мінулай восенню атрымаў правы уязджаць на тэрыторыю Еўрасаюзу, кантактаў будуць пазбягаць многія кіраўнікі дзяржаваў і ўрадаў.

**Працяг на старонцы 3.**

# Галадоўка салідарнасці з Аўтуховічам

Яе абвесцілі Казулін, Статкевіч, іншыя палітыкі.

4 траўня бестэрміновую галадоўку салідарнасці абвясцілі трынаццаць палітыкаў, грамадскіх дзеячаў і моладзевых лідэраў. Патрабаванне — вызваліць з-за кратаў ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча і яго паплечнікаў Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенку, а таксама рэабілітаваць усіх палітвязняў.

Галадоўку абвясцілі экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін, палітыкі Мікола Статкевіч, Лявон Баршчэўскі, Сяргей Скрабец, Вячаслаў Сіўчык, Міхаіл Марыніч, прадпрымальнікі Алесь Макаеў і Сяргей Парсюкевіч, былы палітвязень Андрэй Кім, актывісты «Маладога фронту» Наста Палажанка, Андрэй Цянюта, Мікола Дземідзенка, Арцём Дубскі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Андрэй Кім і Наста Палажанка.

Ва ўправе Партыі БНФ увесь час будуць знаходзіцца чацвёра апошніх. Астатнія будуць галадаць дома. Ініцыятары галадоўкі спадзяюцца, што з часам да акцыі далучацца і іншыя ўдзельнікі.

Былы палітвязень Аляксандр Казулін, які галадаў у турме блізу пяцідзесяці дзён, зазначыў: «Ужо мінула дастаткова шмат дзён з таго моманту, як Мікола Аўтуховіч адмовіўся ад ужывання ежы. Сёння можна гаварыць, што гэта не проста галадоўка, а ахвяраванне жыццём. У такой сітуацыі мы абавязаны праявіць сваю салідарнасць».

Андрэй Кім зазначае, што на цяпер гаворка ідзе пра жыццё Аўтуховіча. І наступнай акцыі салідарнасці 16-га дня ён можа проста не дачакацца. Хлопец заклікаў усіх неабыякавых кожны вечар выходзіць на Кастрычніцкую плошчу, каб выказаць салідарнасць з арыштаванымі.

Старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі заклікаў пачаць збор сродкаў для падтрымкі палітвязняў. Ён папрасіў людзей прыносіць грошы на Управу, пасля чаго яны будуць перададзеныя сем'ям зняволеных.

На думку Аляксандра Казуліна, найважнейшай задачай з'яўляецца тое, каб паказаць свету, што палітвязні ў Беларусі не зніклі, а паранейшаму сядзяць у турмах і ахвяруюць жыццём.

Сам Аўтуховіч галадае ад 16 красавіка. Па словах адваката Паўла Сапелкі, за час галадоўкі прадпрымальнік страціў каля 15 кілаграмаў вагі. Стан здароўя яго ўвесь час пагаршаецца.

**Зміцер Панкавец**

### Тры гады хіміі за гібель цэлай сям'і

У судзе Першамайскага раёна Мінска абвешчаны прысуд па справе аб гібелі ў кастрычніку 2008 г. сям'і падпалкоўніка міліцыі. Смерць траіх чалавек наступіла ў выніку атручання чадным газам. У доме рабілі капітальны рамонт. Падчас дэмантажу вентыляцыі ў пад'ездзе, дзе жыла сям'я, газ не быў адключаны.

Прараб генпадрадчыка ТАА «Рыкомбіс» асуджаны па ч. 2 арт. 305 КК (парушэнне абавязковых для выканання патрабаванняў пры вытворчасці будаўніча-мантажных работаў) на тры гады калоніі-пасялення. Яму забаронена пяць гадоў займаць пасады, звязаныя з будаўніцтвам.

**Вячаслаў Будкевіч, БелаПАН**

## СЦІСЛА

### Каска для Колі

Палова Салігорску стаіць на вушах. 7 траўня ў горад, адкрываць пяты калійны камбінат прыязджае Лукашэнка. Па традыцыі апошняга году, разам з малодшым сынам.

Для Мікалая Лукашэнкі пашылі спецформу, а таксама паставілі на камбінаце арэлі. Праблема толькі ў тым, што нідзе няма адмысловай шахцёрскай каскі для пяцігадовага хлопчыка. Вось і чухаюць патыліцы чыноўнікі, дзе адліць каску для Лукашэнкі-малодшага.

**УШ, Салігорск**

### 9 мая — павышаныя меры бяспекі

9 мая ў Мінску ўсім гледачам урачыстага шэсця давядзецца прайсці праз металадэтэктары, паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення ідэалагічнай працы Мінгарвыканкаму Уладзімір Зубрык. Пры гэтым «ветэранаў ніхто абшукваць не будзе».

### Лукашэнка: «Бог дакладна вырашыў, што хопіць»

«Мяркую, што наперадзе ў нас добрыя адносіны з амерыканцамі. Я абсалютна ў гэтым упэўнены. Мабыць, прыйшоў час, і Бог дакладна вырашыў, што хопіць. Давайце сядайце, размаўляйце і рабіце стасункі лепшымі», — заявіў Лукашэнка ў інтэрв'ю агенцтву Рэйтэр. Ён адзначыў, што амерыканскі пасол зможа вярнуцца ў Мінск пасля адмены санкцый супраць Беларусі.

**ЗП**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Касір | Агулам

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Касір М.П. | Агулам

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,** дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакладу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Віктару В.** з Бабруйскага раёну.
**В.М.** з Брэста.
**Ірыне З.** з Смалявіцкага раёну.
**С.К.** з Гродна.
**Андрэю А.** з Мінскага раёну.
**Аляксандру Б.** з Капыльскага раёна.
**Наталлі Л.** з Дзятлаўскім раёне.
**М.Б.** з Дубровенскага раёну.
**Вользе П., Бернарду П.** з Койданаўскага раёну.
**Мікалаю Р.** з Навагрудскага раёну.
**В.Ц.** з Жлобінскага раёну.
**Міхаілу Т.** з Слуцкага раёну.
**Аляксандру П.** з Новаполацкага раёну.
**М.Х., В.Б.** з Шчучынскага раёну.

Працяг са старонкі 1.

# Пад дыктоўку Еўропы

Цікава, што Беларусь і Малдова на саміце будуць прадстаўленыя на адным узроўні – віцэ-прэм'ераў. Ад Украіны паедуць адразу і прэзідэнт Ющанка, і прэм'ерка Цімашэнка. А вось ад усіх каўказскіх дзяржаваў прыедуць уласна прэзідэнты.

Публічна пра сваё непрымальне прыезду ў Прагу Лукашэнкі заявіў прэзідэнт Чэхіі Вацлаў Клаўс. Ён гаварыў, што не падасць беларускаму лідэру руку. Сам Лукашэнка адрэагаваў на гэтыя словы Клаўса падчас традыцыйнага звароту да народу і парламенту. «Ці хачу яшчэ я, каб ты мне руку падаў», — сказаў ён, а пасля дадаў, калі нават аднаму чалавеку будзе няёмка ад прысутнасці Лукашэнкі ў Празе, то ён не паедзе. Пры гэтым ён падзякаваў Чэхіі за падтрымку Беларусі ў ЕС. Сапраўды, чэшская дыпламатыя, разам з літоўскай, польскай і шведскай, былі сярод лабістаў далучэння Беларусі да партнёрства.

У абмен на непрыезд у Прагу Лукашэнку прапанавалі кампрамісны варыянт – аўдыенцыю ў Папы ў Ватыкане і неафіцыйную сустрэчу з прэм'ер-міністрам Італіі Сільвіё Берлусконі.

Прыватная размова з Бенедыктам XVI адбылася 27 красавіка ў папскай бібліятэцы. Кіраўніка ў падарожжы ў Святы Прастол суправаджаў і малодшы сын Коля, які падарыў пантыфіку расійскі буквар, каб вывучыў мову (не той, каторы ў Беларусі ўжываецца ў школах, а чыста маскоўскі). Наўрад можна гаварыць пра нейкую таемную місію, якую мог выконваць Лукашэнка, каб арганізаваць на беларускай зямлі сустрэчу Папы і Патрыярха Маскоўскага. Тым больш, што РПЦ неаднакроць заяўляла, што ніякія пасярэднікі у гэтай справе ім не патрэбныя.

Таксама Лукашэнка сустракаўся з кардыналам Тарчызіё Бертоне, з якім абмеркавалі пытанне пагаднення (канкардату) паміж Каталіцкай Царквой і беларускай дзяржавай. Ні пра якія канкрэтныя дамоўленасці гаворка не вялася.

Потым беларускі лідэр меў прыватную вячэру з Сільвіё Берлусконі і міністрам замежных справаў Франка Фраціні. Калі Берлусконі называе сваім сябрам Уладзіміра Пуціна, то чаму б яму не сустрэцца і з Лукашэнкам? Берлусконі атрымаў запрашэнне наведаць Беларусь і нібыта даў згоду на прыезд увосені.

Як бы тое ні было, але ў Празе беларускага лідэра мы не пабачым, тым не менш першы выезд на Захад ад 1996 году ўсё ж адбыўся.

**Зміцер Панкавец**

# Казулін: Мы паразумеліся з Пазняком

На саміце «Усходняга партнёрства» Беларусь прадстаўляць і апазіцыйныя палітыкі. У склад альтэрнатыўнай дэлегацыі ўвайшлі былыя кандыдаты на пасаду прэзідэнта Аляксандр Мілінкевіч і Аляксандр Казулін, старшыня КХП-БНФ Зянон Пазняк, лідэр БСДГ Станіслаў Шушкевіч і старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла. Напярэдадні паездкі ў Варшаве прайшлі кансультацыі паміж Пазняком, Казуліным і Шушкевічам. Пра вынікі той сустрэчы, а таксама ўласна пра саміт мы пагутарылі з **Аляксандрам Казуліным.**

**АК:** Гэта была важная і змястоўная сустрэча. Калі Пазняк, Шушкевіч, Сурвілла і Казулін зрабілі сумесную заяву да Еўрасаюзу, то мы разумеем, што і надалей павінны рухацца разам. На гэтай сустрэчы мы абмяркоўвалі вельмі шмат пытанняў. Найперш гаварылі ўвогуле пра тое, ці варта ехаць у Прагу. Мы вырашылі, калі Лукашэнка збіраецца на саміт, то мы таксама там мусім быць. Мы павінны данесці еўрапейскай супольнасці нашы думкі, расказаць аб сапраўднай сітуацыі ўнутры краіны. Важна тое, што разам працуюць людзі розных поглядаў і знаходзяць паразуменне.

**«Наша Ніва»: А чаму з Вамі няма Мілінкевіча?**

**АК:** Гэтае пытанне лепш задаць самому Аляксандру Мілінкевічу. Скажу толькі, што мы прапаноўвалі яму далучыцца да нас, але згоды не атрымалі.

**«НН»: З Пазняком у вас былі не самыя простыя стасункі. Як атрымалася, што цяпер вы апынуліся разам?**

**АК:** Ведаеце, у мяне ніколі не было з Пазняком цяжкіх стасункаў. Магчыма, не было сяброўства. Можа, было нейкае непаразуменне. Аднак калі мы сустракаемся асабіста, калі маем магчымасць паглядзець адзін аднаму ў вочы і параіцца, то ўсё становіцца зразумелым і відавочным. Я заўсёды быў самага лепшага меркавання пра Пазняка. Гэта — чалавек-гісторыя, чалавек-эпоха.

**«НН»: І чаго вы будзеце дабівацца ў Празе?**

**АК:** Ёсць пяць умоваў, якія ўжо неаднаразова ставіў Еўрасаюз перад беларускімі ўладамі. Іх ніхто не адмяняў. Таксама мы лічым вельмі важным, каб быў далучаны яшчэ адзін пункт. Гаворка пра абарону беларускай культуры, адукацыі, а таксама свабоды творчасці. Калі не будзе беларускай культуры і адукацыі, то не будзе нічога. Ні незалежнасці, ні дэмакратыі.

**«НН»: З кім будзеце мець сустрэчы?**

**АК:** Папярэдне запланавана, што мы сустрэнемся з прэм'ер-міністрам Чэхіі Тапаланекам, міністрам замежных справаў Шварцэнбергам. Напэўна, з некім яшчэ з палітыкаў. Будзем знаходзіцца ў Празе ад 5 да 7 траўня.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

5 мая Івонка Сурвілла, Зянон Пазняк, Аляксандр Мілінкевіч і Аляксандр Казулін правялі ў Празе супольную сустрэчу з прэм'ер-міністрам Чэхіі Мірэкам Тапаланэкам. Яны паінфармавалі кіраўніка краіны–старшыні Еўрасаюзу пра палітычныя, эканамічныя і культурныя прыярытэты Беларусі.

# Шчаслівец Хэнлан

Вось здаецца, што ў параўнанні з леташнім чэмпіянатам наша хакейная зборная лепш гуляць не стала. І год назад у Канадзе на роўных змагаліся са Швецыяй, Швейцарыяй, Расіяй, Чэхіяй, але выніку не было. А проста за годную гульню ніхто ж у спорце пунктаў не налічвае.

Затое сёлета не пры самым яркім выступе вынік зборная дае. Большасць звязвае гэта з чарговым прыходам на трэнерскі мосцік канадскага шчаслівчыка Глена Хэнлана. Памятаецца, што таксама яму шанцавала і тры гады таму ў Рызе. Толькі Хэнлану ўдавалася выводзіць беларусаў у чвэрцьфіналы сусветных першынстваў.

Зрэшты, толькі трэнерскім фартам поспехі не растлумачыш. Хэнлан насамрэч цудоўны спецыяліст, які імкнецца не толькі навучыць хакеістаў кідаць па варотах, але і ствараць сямейную атмасферу ўнутры калектыву.

Сёлета ў Швейцарыі быў пастаўлены яшчэ адзін рэкорд. Упершыню ў гісторыі наша зборная на сусветным першынстве атрымала чатыры перамогі запар. Па чарзе беларускія хакеісты адужалі славакаў, венграў, нарвежцаў і фінаў. Першых і апошніх у серыі булітаў, дзе маленькія шэдэўры ствараў Міхаіл Грабоўскі, а сваім нардычным спакоем уражвалі Андрэй Мезін і Алег Антоненка.

Перамога над фінамі стала толькі другім выйгрышам беларусаў на чэмпіянатах свету ў прадстаўнікоў «вялікай хакейнай шасцёркі» (Расія, Канада, Швецыя, Фінляндыя, Чэхія, ЗША). Першая была здабытая дзевяць гадоў таму ў Санкт-Пецярбурзе над расіянамі.

Дарэчы, менавіта з Расіяй мы сустрэнемся на стадыі чвэрцьфіналу. Здавалася б, супернік — горш не прыдумаеш, аднак наш лідэр Міхаіл Грабоўскі заяўляе, што для каманды няма розніцы каго перамагаць на гэтай стадыі.

**ЗП**

6 траўня зборная Беларусі ў чвэрцьфінале згуляе са зборнай Расіі — пераможцай леташняга першынства.




Кожны раз, калі вялікія спартовыя падзеі адбываюцца за межамі Беларусі, беларусы на трыбунах карыстаюцца бел-чырвона-белымі сцягамі. Апошнія разы тое было нават у далёкіх Пусане і Астане. А на хакейным чэмпіянаце ў швейцарскім Клатэне беларусы ўвогуле перамагалі пад Пагоняй, якую вывесіў нейкі гельвецкі беларус.

Працяг са старонкі 1.

# «Дакладваю аб тым, што...»

## Рапарт генерала Лапаціка

У выніку следства ў лістападзе 2000 году генерал-маёр міліцыі Мікалай Лапацік прадставіў рапарт на імя новага міністра ўнутраных справаў Уладзіміра Навумава. У запісцы, напісанай ад рукі, Лапацік, на аснове матэрыялаў, сабраных следчымі, абвінавапіў Віктара Шэймана ў тым, што той даў загад на знішчэнне Юрыя Захаранкі. А загад выконваў Дзмітры Паўлічэнка пры дапамозе Юрыя Сівакова, які забяспечыў групу пісталетам ПБ-9, часова забраным з мінскага СІЗА №1.

Лапацік рабіў вывад, што гэтая ж зброя была выкарыстаная 16 верасня 1999 году. Ён нават назваў прыкладнае месца пахавання зніклых — спецучастак на Паўночных могілках.

У хуткім часе Лапацік быў адпраўлены ў адстаўку. Афіцыйная прычыны — праблемы з здароўем.

Пазней Навумаў і Шэйман заяўлялі, што вывады генералам Лапацікам «былі зробленыя памылковыя».

Генерал Лапацік ведаў, чым яму пагражае такі рапарт, але зрабіў яго і захаваў копіі, якія трапілі ў прэсу ў 2001 годзе.

Ён застаўся жывы, у адстаўцы. Я «пра гэтыя справы гаварыць не буду. Усё, што ведаў, забыў», — заявіў ён у інтэрв'ю «Народнай волі». Ён не рабіў ані палітычнай, ані грамадскай кар'еры на факце сваёй прынцыповасці.



У 1995 годзе генерал Юры Захаранка і маёр Віктар Шэйман былі ў адной камандзе.

PHOTO.BYMEDIA.NET

### Юры Захаранка

нарадзіўся 1 студзеня 1952 у мястэчку Васілевічы (Рэчыцкі раён). Былы міністр унутраных справаў, сябар АГП. Скончыў Акадэмію МУС СССР (1987). Захаранка быў адным з тых людзей, якія прывялі Лукашэнку да ўлады, адным з «маладых ваўкоў», як іх тады называлі. Ад маладога кіраўніка дзяржавы ў аддзяку Захаранка атрымаў пасаду кіраўніка МУС, на якой знаходзіўся да 1995 году.

Потым Лукашэнка адправіў генерала ў адстаўку. Апошняй кропляй стаў публічны пратэст Захаранкі супраць выкарыстання міліцыянтаў як рабсілы Кіраўніцтвам справаў прэзідэнта. «Ламаліся і падстройваліся пад прэзідэнта толькі слабыя», — казаў ужо былы міністр.

Пасля адстаўкі Захаранка стаў у жорсткую апазіцыю да ўлады. Генерал падтрымаў ініцыятыву альтэрнатыўных прэзідэнцкіх выбараў 1999 году, увайшоў у каманду Міхаіла Чыгіра. Ён стварыў Саюз афіцэраў.

Палітык знік 7 траўня 1999 году. Некалькі чалавек бачыла, як у прамежку часу ад паловы на дзевятую да паловы на дзесятую трое ў штацкім каля вуліцы Магілёўскай скруцілі чалавека, падобнага да Захаранкі, запіхнулі ў цёмныя «жыгулі» і павезлі ў бок вуліцы Жукоўскага. Ад таго моманту ніхто Захаранкі больш не бачыў.

Генеральны пракурор Алег Бажэлка ў першыя дні пасля знікнення заяўляў, што Захаранка прапаў па ўласнай волі, каб не быць прыцягнутым да крымінальнай адказнасці. Па меры таго, як ішлі гады, нават БТ перастала такую версію агучваць.

## Арышт Паўлічэнкі

Кіраўнік СОБРа Дзмітры Паўлічэнка быў арыштаваны 22 лістапада 2000 году, г.зн. праз дзень пасля рапарту Мікалая Лапаціка. Ордэр на арышт далі тагачасныя кіраўнік КДБ Уладзімір Мацкевіч і генпракурор Алег Бажэлка.

У ордэры адзначалася, што «Паўлічэнка з'яўляецца арганізатарам і кіраўніком крымінальнай структуры, якая мела дачыненне да выкрадання і забойства людзей». У прыватнасці, гаварылася пра забойства кіраўніка філіі расійскай фашыстоўскай арганізацыі РНЕ Глеба Самойлава. У СМІ з'яўляліся звесткі, што пэўныя асобы ў сілавых структурах мелі дачыненне да шкалення баевікоў РНЕ, якіх меркавалася нацкоўваць на апазіцыю і проста незадаволеных. Характэрна, што асуджаныя байцы «Алмазу» з групы Ігнатовіча з РНЕ былі звязаныя, хоць, па ідэі, супрацоўнікі такой структуры не маюць права ўдзельнічаць у палітызаваных парамілітарных суполках.

Следчы Дзмітры Петрушкевіч з часам паведаміў, што Паўлічэнка быў змешчаны ў ізалятар КДБ, дзе з ім асабіста гутарыў Алег Бажэлка. Найбольш яго цікавіла месца пахавання Дзмітрыя Завадскага.

Не выключана, што нейкую інфармацыю з Паўлічэнкі выцягнуць тады ўдалося, бо генпракурор зрабіў запыт свайму расійскаму калегу з просьбай прадставіць тэхніку, якая займаецца вышукваннем трупаў у зямлі, такой у Беларусі не было.

Ордэр на арышт Паўлічэнкі быў выпісаны на 30 дзён, але цягам бліжэйшых сутак ён зноў акажацца на свабодзе. Нехта з самага верху аддаў загад: выпусціць.

Не пройдзе і тыдня, як 27 лістапада Лукашэнка знімае з пасадаў Бажэлку і Мацкевіча. 28 лістапада на імя генпракурора Расіі прыйшоў новы ліст, што патрэба ў тэхніцы адпала. Адначасова з генпракурорам і шэфам КДБ пасаду страціць і Шэйман, але апошні вельмі хутка зноў усплыве на вяршыні ўлады.

Ужо на волі Паўлічэнка заявіў журналістам, што ён чалавек адданы Лукашэнку і гатовы выканаць любы ягоны загад.

Ні Уладзімір Мацкевіч, ні Алег Бажэлка ніколі публічна не выказваліся адносна расследавання гэтай справы.

Паўлічэнка кіраваў акцыямі запалохвання ў часе выбараў 2006 году і дагэтуль займае высокія пасады ў праваахоўным апараце. Што зачапіла многіх — з часам ён атрымае найвышэйшыя ўзнагароды Расійскай праваслаўнай царквы.

## Эскадроны смерці

У чэрвені 2001 году, напярэдадні прэзідэнцкіх выба-



### Генадзь Карпенка

Досыць часта ў адзін шэраг з дадзенымі знікненнямі ставяць раптоўную смерць кіраўніка ценявога ўраду апазіцыі Генадзя Карпенкі. 31 сакавіка 1999 Карпенку даставілі ў 9-ы клінічны шпіталь сталіцы з дыягназам «крывацёк у мозг». 1 красавіка яму зрабілі аперацыю па выдаленні гематомы. Не ўратавала. Карпенка памёр 6 красавіка. Да таго малады гаспадарнік і палітык на здароўе не скрадзіўся і быў у добрай фізічнай форме.



Той самы расстрэльны пісталет.



Лопатик И.В.
Для исполнения
21.11.2000

Министру Внутренних дел
Республики Беларусь
генерал-майору мил...
В.В. Наумову

рапорт

Докладываю о том, что мною получена
информация следующего содержания:
В апреле 1999 года Шейман В.А. дал у[illegible]
Сивакову Ю.Л. допустить в СИЗО №1 ГУВД

### Рапарт міністру ўнутраных справаў Навумаву У.У. Рэзалюцыя: «Для выканання»

Дакладваю аб тым, што мной атрыманая інфармацыя наступнага зместу. У красавіку 1999 году Шэйман В.У. даў указанне міністру ўнутраных справаў Сівакову Ю.Л. дапусціць у СІЗА №1 ГУУС Мінгарвыканкаму камандзіра СОБРа Паўлючэнку (у першыя гады гэтае прозвішча сустракаецца ў дакументах менавіта ў такой форме — **Рэд.**) падчас выканання працэдуры расстрэлу прыгаворанага да гэтай меры пакарання і наступных дзеянняў па ягоным пахаванні. Сівакоў Ю.Л. дадзенае ўказанне перадаў начальніку СІЗА Алкаеву А.Л. Паўлючэнка да працэдуры быў дапушчаны. 6 мая 1999 году Шэйман В.У. даў указанне Сівакову Ю.Л. выдаць пісталет, якім прыводзіцца ў выкананне прысуд аб смяротным пакаранні, Паўлючэнку. Сівакоў даў указанне Алкаеву выдаць пісталет, які ў яго захоўваўся, Паўлючэнку, што Алкаеў і выканаў. У дадзены час Шэйман В.У. даў указанне Паўлючэнку фізічна знішчыць былога міністра ўнутраных справаў Захаранку Ю.М. Інфармацыйнае забеспячэнне месцазнаходжання Захаранкі Паўлючэнку было забяспечана спецпадраздзяленнем Васільчанкі М.В., заданне на якое яму таксама даў Шэйман В.У. праз сваіх супрацоўнікаў. Акцыя захопу і наступнага знішчэння Захаранкі была здзейсненая Паўлючэнкам, камандзірам роты СОБРа... (далей неразборліва), камандзірам першай роты спецназу в/ч і чатырма ягонымі байцамі. 8 мая 1999 году пісталет Паўлючэнка здаў Алкаеву. Па ..... (неразборліва). 16 верасня 1999 г. Паўлючэнка правёў акцыю захопу Ганчара В.І. і Красоўскага А.С. Месца пахавання трупаў Захаранкі Ю.М., Ганчара В.І., Красоўскага А.С. — спецучастак нумарных могілак на Паўночных могілках.

Начальнік ГУКМ [Галоўнага ўпраўлення крымінальнай міліцыі] генерал-маёр міліцыі Лапацік.

21 лістапада 2000 г.

раў, новую інфармацыю па справе знікненняў далі былыя следчыя рэспубліканскай пракуратуры Дзмітры Петрушкевіч і Алег Случак. Яны заявілі, што ў краіне існуе так званы «эскадрон смерці», які быў створаны міністрам унутраных спраў Юрыем Сіваковым па загадзе сакратара Рады бяспекі Віктара Шэймана. Па інфармацыі следчых, брыгаду ўзначальваў Дзмітры Паўлічэнка. Пасля адстаўкі Сівакова «эскадрон» нібыта перайшоў пад кантроль Уладзіміра Навумава.

Петрушкевіч і Случак паведамілі, што групай было здзейснена блізу 30 забойстваў.

У страху перад расправай былыя следчыя папрасілі палітычнага прытулку ў ЗША і яго атрымалі.

Сваё расследаванне вёў і супрацоўнік КДБ (аддзелу, які займаецца палітычным вышукам) Генадзь Угляніца, зяць вядомага дзеяча нацыянальнага руху Радзіма Гарэцкага. Разам з сваім сябрам з патрыятычнай арганізацыі «Край» Андрэем Жарнасекам яны спрабавалі знайсці месцы пахаванняў. У выніку заблытанай гісторыі яны таксама папрасілі палітычнага прытулку — ім яго дала Нарвегія. Там яны і працуюць, месца іх пражывання не афішуецца.

## Рапарт Алега Алкаева

Начальнік мінскага СІЗА Алег Алкаеў напісаў, што выдаваў расстрэльны пісталет (той, які выкарыстоўваюць для прывядзення ў выкананне смяротных прысудаў) па асабістым загадзе міністра Сівакова. У тыя самыя перыяды, калі зніклі Захаранка і Ганчар з Красоўскім.

Гэты факт цалкам супадае з дакладам генерала Лапаціка. Асцерагаючыся расправы, Алкаеў выехаў з сям'ёю ў эміграцыю ў Нямеччыну, дзе напісаў кнігу «Расстрэльная каманда».

Нямеччына прытуліла і сем'і Захаранкі і Карпенкі. Жонка Красоўскага знайшла прытулак у ЗША. Сваякі Ганчара і Завадскага засталіся жыць у Мінску.

Алкаеў сцвярджае, што існуе асобны відэазапіс расстрэлаў зніклых.

## Відэазапіс

Пра відэазапіс з жудаснымі падрабязнасцямі расказваюць шэптам і некаторыя дзеячы мастацтва, блізкія да лукашэнкаўцаў. Быццам бы паказвалі ім той запіс у 1999 годзе кіраўнікі сілавікоў, якія каардынавалі расследаванне. Выходзіць, гэтыя асобы баяліся застацца адзінымі носьбітамі смяротнае інфармацыі?

## Даклад Хрыстаса Пургурыдэса

Комплексным расследаваннем знікненняў Захаранкі, Ганчара, Красоўскага і Завадскага займаўся спецдакладчык Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы кіпрскі дэпутат Хрыстас Пургурыдэс. Ён некалькі разоў наведваў Беларусь, дзе меў спатканні, як з прадстаўнікамі ўлады, што фігуруюць у гэтай справе, так і з сваякамі зніклых.

Вынікам працы Пургурыдэса стала тое, што Віктару Шэйману, Юрыю Сівакову, Уладзіміру Навумаву і Дзмітрыю Паўлічэнку і сёння забаронены ўезд у краіны Еўрасаюзу, нават пасля зняцця візавых санкцый у дачыненні да беларускіх чыноўнікаў.

У 1999 годзе з патрабаваннем справядлівага расследавання тых злачынстваў на вуліцы Мінску выходзілі тысячы людзей. Тэма чырвонай ніткай прайшла праз выбарчую кампанію 2001 году. А потым грамадскі інтарэс стаў паціху згасаць. Праўда, і цяпер 16-га дня кожнага месяца людзі выходзяць на плошчы з партрэтамі зніклых. Гэтак і 7 мая, у дзень пачатку Пражскага саміту, неабыякавыя зноў збяруцца на Кастрычніцкай плошчы, каб яшчэ раз нагадаць свету пра зніклых людзей.

Сабраныя звесткі пакідаюць упэўненасць, што следства ў справах некалі абавязкова будзе скончанае.

**Зміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Віктар Ганчар**

Віктар Ганчар нарадзіўся 7 верасня 1958 у вёсцы Родзічава на Міншчыне. Скончыў юрфак БДУ. На выбарах 1994 Ганчар быў адным з кіраўнікоў штабу Лукашэнкі. Аднак у 1996 Ганчар ужо быў сярод ініцыятараў імпічменту кіраўніка Беларусі. У маі 1999 намаганнямі Ганчара была арганізаваная альтэрнатыўная кампанія па выбарах прэзідэнта. А праз два месяцы палітык абвясціў пра сканчэнне тэрміну легітымнага кіравання Аляксандра Лукашэнкі.

Ганчара і Красоўскага яднала даўняе сяброўства. Яны зніклі 16 верасня 1999, прыкладна а 23-й вечара. Мужчыны ў той вечар, як і штотыдзень, накіраваліся ў лазню на вуліцы Фабрычнай. Потым Ганчар яшчэ патэлефанаваў сваёй жонцы Зінаідзе, што хутка вернецца, але дадому ён так і не даехаў. Недалёка ад лазні было знойдзенае шкло ад машыны Красоўскага, а таксама плямы крыві.

**Анатоль Красоўскі**

нарадзіўся 17 мая 1952 у Крупках. Скончыў фізфак БДУ. Доўгі час працаваў педагогам. Быў распрацоўшчыкам школьнага курсу «Этыка і псіхалогія сямейнага жыцця». Ад 1990-х заняўся прадпрымальніцкай дзейнасцю, заснаваў фірму «Красіко». Дапамагаў грашыма апазіцыі. Красоўскі быў арыштаваны спецслужбамі ў жніўні 1999 году і змешчаны ў СІЗА, дзе яму фактычна было прад'яўленае абвінавачванне ў падрыўной дзейнасці. Потым высветлілася, што Красоўскага абвінавачваюць у тым, што своечасова не вярнуў крэдыт, узяты ў банку «Пошук». Праз тыдзень, калі абвінавачанне развалілася, бізнесмена вызвалілі.





PHOTO.BYMEDIA.NET

**Дзмітры Завадскі**

Нарадзіўся 28 жніўня 1972 у Мінску. Журналіст. У 1994—1997 гадах з'яўляўся асабістым тэлеаператарам Аляксандра Лукашэнкі. Потым працаваў на расійскім тэлеканале ОРТ, у тым ліку ў Чачні. Дзмітры знік 7 ліпеня 2000, калі накіроўваўся ў аэрапорт, каб сустрэць калегу Паўла Шарамета **(на фота — справа)**. Машыну Завадскага потым знайшлі ў аэрапорце, але самога журналіста больш ніхто не бачыў.

У 2002 Мінскі абласны суд у справе знікнення Завадскага прыгаварыў да пажыццёвых зняволенняў былых супрацоўнікаў спецыяльнага атраду міліцыі «Алмаз» — Валерыя Ігнатовіча і Максіма Маліка. Аляксей Гуз атрымаў 25 гадоў турмы, а Сяргей Савушкін — 12. Суд праходзіў пры зачыненых дзвярах. Па версіі пракуратуры, у Ігнатовіча быў матыў для здзяйснення злачынства — помста. У адным з інтэрв'ю «БДГ» Дзмітры Завадскі апавёў, што чуў ад калегаў у Чачні гісторыю пра арышт беларуса, які прайшоў спецпадрыхтоўку ў мінскім «Алмазе», але ніякіх прозвішчаў там названа не было.

Наколькі вядома, на судзе ніхто з абвінавачаных вінаватым сябе не прызнаў. Ужо па скачэнні працэсу Павел Шарамет заявіў, што «група Ігнатовіча» магла быць выканаўцаю забойства, але заказчыкамі былі зусім іншыя людзі. У прыватнасці, Шарамет згадваў прозвішча Віктара Шэймана ў сувязі з гэтай справай.



переданному через начальника КМ МВД Кадушкина С.А. мною был допущен к присутствию при исполнении приговоров командир „СОБР" Дмитрий Павлюченко. Цель его присутствия мне неясна и неизвестна. Мне о ней ничего не говорили.

В этот день было расстреляно пять человек. Павлюченко присутствовал при расстреле каждого. В одном из моментов он спросил моего исполнителя, почему он стреляет в голову а не в сердце заявив при этом, что

**З пратаколу допыту сведкі Алкаева Алега Леанідавіча**

Следчы, намеснік начальніка аддзелу Пракуратуры РБ, дарадца юстыцыі Казакоў Я.Г.

(...) Недзе ў сярэдзіне кастрычніка 1999 году Кадушкін С.А. у маім кабінеце пазнаёміў мяне з камандзірам СОБРа Паўлючэнкам Дзмітрыем і сказаў, што міністр унутраных справаў Сівакоў Ю.Л. патрабуе ўдзелу ці прысутнасці гэтага чалавека пры правядзенні ў выкананне смяротных прысудаў. Пры гэтым Кадушкін сказаў, што як ён ні пераконваў міністра не рабіць гэтага, міністр катэгарычна настойваў на сваім. Падначальваючыся ўказанню міністра, перададзенаму праз Кадушкіна, 22.10.1999 г., у дзень, прызначаны для прывядзення ў выкананне смяротнага выраку, для, дакладней, у адносінах пяці асуджаных, мной быў пастаўлены ў вядомасць Паўлючэнка Дз., які ва ўмоўлены час прыбыў да мяне ў кабінет і разам з мной прысутнічаў пры расстрэле пяці чалавек. Прычым ён знаходзіўся непасрэдна ў памяшканні, дзе прыводзяцца ў выкананне выракі, разам з выканаўцам. З гуманных меркаванняў, дзеля змяншэння пакутаў асуджаных, расстрэл здзяйсняецца стрэлам у патыліцу з пісталета з глушыцелем. Паўлючэнка пацікавіўся ў выканаўцы, чаму ён не страляе ў сэрца. На ягоную думку, гэта эфектыўней і менш крыві. Са словаў выканаўцы, чалавека дасведчанага, такую заяву мог зрабіць чалавек, які выкарыстоўваў вышэйсказанае на практыцы. (...) Пісталет для прывядзення ў выкананне смяротных выракаў знаходзіцца і захоўваецца ў сейфе начальніка ўстановы СІЗА №1 і ў дзень прысудаў выдаецца выканаўцу. (...) Гэты пісталет двойчы выдаваўся паводле асабістага ўказання міністра Сівакова Ю.Л. пры наступных абставінах асобам, якія не маюць адносінаў да членаў спецыяльнай групы. У першы раз 30 красавіка пісталет быў атрыманы палкоўнікам міліцыі Дзікам В.М. па пісьмовым указанні намесніка міністра Чванкіна А.А. быццам бы для правядзення вучэбна-трэніровачных стрэльбаў. Гэтае ўказанне ў пісьмовым выглядзе Дзік паказаў мне, але не пакінуў. Пісталет вернуты 14 мая 1999 году. Наступны раз пісталет быў атрыманы 16.09.1999 г. ад'ютантам міністра Сівакова Ю.Л. Мне пазваніў Кадушкін, перадаў асабістае ўказанне міністра аб выдачы гэтай зброі ад'ютанту Калеснікаву В.П. Вернуты быў пісталет 18.09.1999 г. Адпаведныя запісы аб выдачы зброі ёсць у кнізе. (...)

# Лёс чатырох

Піша **Віталь Тарас**.

Цяпер той інцыдэнт мала хто згадвае. Незадоўга да знікнення Юрыя Захаранкі ў цэнтры Мінску адбылося затрыманне яго і Генадзя Карпенкі. Гэтаму была прысвечаная экстрэнная прэс-канферэнцыя ў кватэры на першым паверсе аднаго са старых дамоў на праспекце Незалежнасці (тады Скарыны). Тады там быў карпункт адной з расійскіх тэлекампаніяў. Сведкі распавялі пра тое, як у іх на вачах, проста ў двары, апальным палітыкам перакрылі шлях спецназаўцы і асобы ў цывільным. Прычым, сярод іх былі і нядаўнія падначаленыя экс-міністра. Некаторыя сарамліва ўсміхаліся. Затрыманых без тлумачэнняў пасадзілі ў машыну і некуды павезлі. Праз некаторы час іх выпусцілі.

Памятаю стан узбуджэння, у якім перабывалі тады многія журналісты, у тым ліку і я. Падобныя бандыцкія дзеянні тады яшчэ не былі звыклымі для прэсы. Хадзілі дзіўныя чуткі пра камандзіра роты СОБР (спецаддзелу хуткага рэагавання) нейкага Паўлічэнку, які ездзіць па горадзе ў пошуку ворагаў рэжыму на чырвоным БМВ.

Ад гэтага патыхала таннай сенсацыяй, пошласцю, але, здавалася, ніяк не смерцю. За два з паловай гады да згаданага здарэння з Захаранкам, стрэлілі ў службовую машыну Карпенкі. Пазней была начная пагоня па горадзе за Віктарам Ганчаром — таксама са стралянінай, у выніку якой паранілі яго памочніцу. На той момант Ганчар працаваў у Эканамічным судзе СНД у Мінску.

Усё разам нагадвала фрагменты нейкага гангстэрскага серыялу. Але не ўспрымалася ўсур'ёз да канца. Пасля мая 1999-га ўсё змянілася. Праўда, таксама не адразу. Думалася, можа, да знікнення экс-міністра ўнутраных справаў мелі дачыненне нейкія крымінальнікі? Не верылася, што крымінальнікі могуць быць ва ўладзе...

### Стылістычныя разыходжанні

З Віктарам Ганчаром мне пашчасціла некалькі разоў убачыцца пры жыцці, браць у яго інтэрв'ю. Юрыя Захаранку бачыў толькі на прэс-канферэнцыях. Яны былі, зразумела, зусім рознымі людзьмі, з розным досведам у жыцці і ў палітыцы. Але было і нешта супольнае.

Найперш — прыгажосць. Зразумела, маю на ўвазе не гламурную прыгожосць у стылі модных выданняў ці тэлеэстэтыкі «першых каналаў». Хоць чарнавусага генерала міліцыі Захаранку ў белым кіцелі лёгка сабе ўявіць на вокладцы часопісу. І Віктар Ганчар быў надзвычай тэлегенічны. Абодва заўсёды падцягнутыя, бездакорна акуратныя, энергічныя.

Ды кожны з тых, каго мы завем невыразным словам «зніклыя», быў абаяльным і прыгожым: Анатоль Красоўскі і Зміцер Завадскі таксама, безумоўна. Паглядзіце на іх фатаграфіі. Паглядзіце на твары жонак і дзяцей гэтых людзей. А цяпер параўнайце іх з фатаграфіямі Навумава, Паўлічэнкі, Сівакова, Шэймана... Альбо з партрэтамі «членаў палітбюро», вынесенымі нядаўна на першую паласу «Нашай Нівы».

Некаму можа падацца суб'ектыўным, нават недарэчным такі «фізіягнамічны» падыход, развагі пра эстэтыку. Суб'ектыўнасці не хаваю. Але, на мой погляд, мараль і эстэтычныя густы часам намёртва звязаныя паміж сабой. Квазімода не любіць прыгожых людзей, красналюдкі не выносяць волатаў. Паставіць гіпсакардонную дэкарацыю на месцы зруйнаванага помніку



гісторыі, спілаваць стогадовыя дубы, вылаяцца матам, ударыць кулаком у твар жанчыну — вось іх эстэтычнае крэда.

Некалі расійскі літаратар-дысідэнт Андрэй Сіняўскі (за творы, апублікаваныя за мяжой, ён атрымаў разам з Юліем Даніэлем 7 гадоў лагераў) казаў, што ў яго «з савецкай уладай стылістычныя разыходжанні». І ў гэтым не было ні позы, ні крывадушнасці. Бо эстэтычныя каштоўнасці, стыль творчасці маюць куды больш грунтоўнае значэнне, чым палітычныя прынцыпы. Фактычна, у стылі жыцця праяўляецца этыка.

### Мемарандум Пургурыдэса

У сувязі з запрашэннем Беларусі далучыцца да праграмы ЕС «Усходняе партнёрства» галоўным чынам абмяркоўваюць, ці паедзе Аляксандр Лукашэнка ў Прагу 7 мая. І рэдка згадваюцца імёны зніклых. Нават аўтары адкрытага ліста Еўрасаюзу Івонка Сурвілла, Зянон Пазняк, Станіслаў Шушкевіч і Аляксандр Казулін хоць і пішуць пра маральныя прынцыпы, але пра зніклых наўпрост не гавораць. (Што не дзіўна, калі ўспомніць, што адзін з аўтараў казаў некалі, што не верыць у знікненне Віктара Ганчара.)

Між тым, сапраўды ёсць не толькі маральныя, але і некаторыя фармальна-юрыдычныя падставы еўрапейцам пра нешта нагадаць. У свой час у Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы была створаная камісія, якую ўзначаліў Хрыстас Пургурыдэс. Мемарандум Пургурыдэса «Зніклыя людзі ў Беларусі» 2004 году грунтуецца ў асноўным на вядомых паказаннях начальніка мінскага следчага ізалятара Алкаева і пісьме генерала міліцыі Лапаціка. Адна з рэкамендацыяў таго мемарандуму — «заклікаць дзяржавы Рады Еўропы і ў цэлым міжнародную супольнасць рабіць максімум палітычнага ціску на цяперашняе кіраўніцтва Беларусі, у тым ліку праз санкцыі, да таго часу, пакуль не будзе праведзенае расследаванне, якое заслугоўвае даверу, адносна магчымай датычнасці высокапастаўленых чыноўнікаў да знікненняў альбо іх схавання».

Такое расследаванне не праведзенае. Праўда, некаторыя высокапастаўленыя чыноўнікі, згаданыя ў тым дакладзе, працуюць на новых пасадах альбо адпраўленыя на пенсію.

### Пад трыбунал ніхто не ідзе

Мы часта заклікаем еўрапейцаў навесці ў нас парадак з правамі чалавека, апелюем да Еўрасаюзу, ускладаем надзеі на Гаагскі трыбунал. А што ж мы самі?

За мінулыя дзесяць гадоў мы бачылі «ланцугі неабыякавых людзей», пікеты ў памяць зніклых і ў падтрымку іх сваякоў. Беларускія апазіцыянеры шмат разоў узнімалі гэтую тэму на сустрэчах з заходнімі палітыкамі. Але ж ці былі ў Беларусі спробы стварыць, напрыклад, незалежны грамадскі трыбунал, суд або камісію? Хоць многія дэпутаты ВС 13-га склікання ад апазіцыі, былыя калегі і паплечнікі Ганчара, дагэтуль актыўна займаюцца палітыкай. А незалежным расследаваннем у гэтай справе працягваюць займацца толькі Алег Волчак і яшчэ некалькі энтузіястаў.

Праблема палягае ў тым, што пераважная частка беларускага грамадства нічога не ведае і не жадае ведаць пра лёс зніклых. Грамадства, пазбаўленае маральных прынцыпаў, усё ж такі пэўныя прынцыпы мае. Іх усяго чатыры: ніколі ні ў што не ўмешвацца, не выказваць салідарнасці, не спачуваць, нічога не ведаць.

Грамадства, вядома, складаецца не толькі з такіх людзей, інакш не было б і гісторыі. Калі-небудзь партрэты Ганчара, Завадскага, Захаранкі, Красоўскага як герояў свайго часу абавязкова будуць друкавацца на старонках падручнікаў і хрэстаматыяў. Побач з партрэтамі іх катаў. Каб памяталі.

## ЦЫТАТЫ

### Айцец Аляксандр Надсан: Папа, як і Хрыстос, павінен клікаць грэшнікаў

Апостальскі візітатар для беларускіх каталікоў у замежжы так ацаніў сустрэчу Аляксандра Лукашэнкі з Бенедыктам XVI: «Хрыстос казаў: я прыйшоў не да праведнікаў, але каб паклікаць грэшнікаў да пакаяння. І Папа, як галава Царквы Хрыстовай, далей ідзе тым жа шляхам. Ён усіх прымае, каб хоць трошкі пасеяць зерне дабра дзеля набліжэння да Бога, да Хрыста. Ці дасць гэта зерне свой плод — мы не ведаем».



Сяргей Мартынаў.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Сяргей Мартынаў: Палітвязняў няма, толькі крымінальнікі

Выступаючы ў Рызе, міністр замежных справаў Беларусі адзначыў, што ў ягонай краіне «не арыштоўваюць за палітычныя перакананні». «У Беларусі няма палітвязняў, а ёсць апазіцыянеры, якія апынуліся за кратамі выключна ў выніку крымінальных злачынстваў», — сказаў ён.

### Пасол Нідэрландаў: Мы не за ізаляцыю Беларусі, але падыходзім строга

Напярэдадні саміту «Усходняга партнёрства» на пытанні «НН» адказаў пасол Нідэрландаў у Польшчы і па сумяшчальніцтве ў Беларусі Марнікс Кроп.

«Нідэрланды хочуць інтэнсіўна супрацоўнічаць з Беларуссю, — адзначыў ён. — Але мы падыходзім строга, калі справа датычыцца захавання еўрапейскіх прынцыпаў дэмакратыі і правоў чалавека. Калі Беларусь прымае гэтыя прынцыпы, — тады ваша краіна можа зрабіць больш, каб давесці, што гэта так». Нагадаем, менавіта міністр замежных справаў Нідэрландаў Максім Ферхаген рашуча выступаў супраць прыезду Лукашэнкі ў Прагу. Поўны тэкст гутаркі з пaслом чытайце на інтэрнэт-сайце NN.By.

### Жанчыны Кеніі: Хочаце сэксу — кідайце ваяваць

Тысячы кенійскіх жанчынаў абвесцілі, што на сем дзён адмаўляюцца ад сэксуальных зносінаў з мужчынамі. Так яны выказваюць пратэст супраць жорсткае барацьбы за ўладу ў краіне, у выніку якой гінуць людзі.

«Мы пастанавілі, што нашым адказам будзе адлучэнне іх ад любошчаў, — зазначыла Рукія Субоў, кіраўнічка жаночай суполкі «Арганізацыя для развіцця жанчынаў». — У сэксу няма партыйнай прыналежнасці». Да пратэсту далучылася нават жонка прэм'ера Кеніі **(на фота ўнізе)**.



# Генадзь Бураўкін: «Мой першы натхняльнік — Юля»

9 мая ў адной з найзнакаміцейшых беларускіх сем'яў — Юліі і Генадзя Бураўкіных — юбілей: яны разам 50 гадоў.



Спадар Генадзь у красавіку перанёс шунтаванне сэрца, ён знаходзіцца цяпер у бальніцы. Аднак з задавальненнем скарыстаўся магчымасцю сказаць колькі слоў пра сям'ю і яшчэ раз прызнацца ў каханні да той, якая праз усё жыццё была побач.

— 9 траўня 1959 году мы з Юляй распісаліся. Паколькі ў нашых бацькоў не было сродкаў наладжваць урачыстасці, вяселле зрабіў філфак: мой пяты курс аддзялення журналістыкі і Юлін трэці курс беларускага аддзялення. Вяселле было шумнае, вясёлае, студэнцкае. Святкавалі ў сталоўцы універсітэту — у падвале пад біякорпусам. Асабіста мне запомнілася ванна, поўная вінегрэту — яго згатавалі Юліны дзяўчаты, — які быў з'едзены яшчэ да перапынку... Па свежых слядах Сеня Блатун напісаў цэлую паэму пад «Тарнаса на Парнасе». Яе перадавалі з вуснаў у вусны. Нават не ведаю, ці захавалася яна дзе ў пісьмовым выглядзе. Памятаю адтуль радкі:

Народ усё быў нетакоўскі:
Сам Ніл Гілевіч, Матукоўскі…

**— Значыцца, Гілевіч і Матукоўскі таксама былі вашымі гасцямі?**

— Так, быў Ніл, з якім мы сябравалі, быў і Мікалай — мой самы даўні і самы блізкі сябра. Таксама як і былі Рыгор Барадулін і Вася Зуёнак.

**— Але з чаго ўсё пачалося? Калі ўпершыню звярнулі ўвагу на будучую сваю жонку?**

— У студэнцкім буфеце. Я тады быў на трэцім курсе, а Юля прыйшла на першы. Падчас перапынкаў мы бегалі ў буфет перакусіць — звычайна бутэлькай кефіру і батонам. Памятаю, убачыў у чарзе дзяўчыну, якая мне адразу спадабалася. А пазнаёміліся мы пазней — калі яна прыйшла ў тэатральны калектыў універсітэту, дзе я ўдзельнічаў.

**— Былі вядучым акцёрам?**

— Вядучымі акцёрамі там былі Ігар Дабралюбаў і Лёва Тамільчык, цяперашні акадэмік. Я быў таксама на прыкметных ролях. Наш калектыў лічыўся адным з найлепшых самадзейных тэатральных калектываў... Вось тады і завязаліся нашыя з Юляй узаемаадносіны, што прывялі да рамантычнага студэнцкага кахання, якое вылілася ў вяселле.

Дарэчы, я і тады захварэў, але на туберкулёз. У палаце было чалавек трыццаць ці сорак, дык мае суседзі былі паракананыя, што Юля, якая часта прыходзіла да мяне, мая сястра. Яны не маглі ўявіць, што сімпатычная маладая дзяўчына ходзіць да туберкулёзніка... Я вельмі ўдзячны, што ў самыя цяжкія моманты яна заўсёды была побач.

**— А дзе вы сталі жыць, як згулялі вяселле?**

— На прыватнай кватэры. Хоць на мяне і была заяўка з рэдакцыі віцебскай абласной газеты — ажно на загадчыка аддзелу культуры. Для выпускніка гэта ого якая вышыня! І зарплата адпаведная, і з кватэрай рэдактар абяцаў вырашыць пытанне. Але мы з Юляй вырашылі застацца ў Мінску. Папершае, мне трэба было працягваць лячэнне, але галоўным было тое, што Юлі давялося б пераводзіцца на завочнае аддзяленне, дабаўляўся б яшчэ год вучобы.

**— Вы вось узгадалі Барадуліна. І ён, і вы былі жанатыя толькі аднойчы, вернасць юнацаму каханню абодва пранеслі праз усё жыццё.**

— Я ў гэтым сэнсе старамодны — так цяпер рэдка бывае, але ў мяне няма ніякага шкадавання. Наадварот... Што ж тычыцца Рыгора, дык да жаніцьбы ён часта да нас прыходзіў. Зарабляючы нейкую капейчыну, мы пісалі ўсялякія перадачы на радыё.

Пасля наша кватэра, ужо «ўласная» і прасторная, стала «сваёй» не толькі для Рыгора. Яна была гасцінная і для Васіля Быкава, і для Ніла Гілевіча, і для Пятра Клімука, Валодзі Кавалёнка. Заўсёды дарагімі і жаданымі гасцямі былі Ігар Шклярэўскі з Масквы і Павел Боцу і Ліву Даміян з Малдавіі — царства ім нябеснае, — а таксама Іван Драч, Дзмітро Паўлычка і выдатнейшы і любімейшы ва Украіне кампазітар Сашко Білаш. Ужо не кажу пра нашых знакамітых мастакоў Леаніда Шчамялёва, Гаўрылу Вашчанку, Аляксея Марачкіна, братоў-пісьменнікаў Валянціна Болтача, Віктара Казько, Сяргея Законнікава... І, канечне, у гэтым заслуга перш за ўсё Юлі, бо яна была не толькі шчодрай гаспадыняй, але і нашым аднадумцам, чалавекам, блізкім да таго, чым мы жылі, за што хваляваліся, за што змагаліся. І, можа, таму ў нас такі доўгі ўзаемны саюз — у нас аднолькавыя адносіны і маральных прынцыпах. Для мяне заўсёды было вялікай радасцю, што вельмі дарагія і важныя для мяне госці «прымалі» не толькі мяне, але і Юлю, і нашых дзяцей — сына Лёшу і дачку Свету.

**— А ці часта вы прысвячалі сваёй жонцы вершы?**

— Адзін з першых я ўключаю ва ўсе кніжкі, бо ён мне здаецца адным з маіх, як кажуць, фірменны — гэта «Юнацтва сінія арэлі»:

Яны прыглушана рыпелі
Сярод старых кашлатых ліп.
Мы тыя сінія арэлі
Зламаць нікому не далі б…

Ну, а што тычыцца астатніх... Калі выйшла кніга «Чытаю тайнапіс вачэй... Вершы пра каханне», многія пыталіся: няўжо ўсе вершы прысвечаныя Юлі? Я звычайна адказваў: не трэба ўжо так сцвярджаць, што ўсе да аднаго, але практычна ў кожным з іх Юля прысутнічае.

**— Здаецца, быў у вас яшчэ адзін верш, які вы напісалі раней за «Юнацтва сінія арэлі», калі нежанатыя былі…**

— Калі мы з Рыгорам Барадуліным яшчэ вучыліся, дык самы яго славуты верш быў «Кухня Насці», які ён прывёз з цаліны, а мой — «Зноў пабачыў цябе...»:

Цэлы тыдзень хадзіў я прыгнечаным.
Не гулялася, не спявалася.
Кожнай раніцай,
Кожным вечарам
Сэрцу нечага не ставала ўсё.

А сягоння
Зусім няпрошана,
Нечакана, неспадзявана я
Зноў убачыў цябе,
Харошая,
Дарагая,
Нецалаваная…

Быў малады, закаханы. І калі не было прысвячэння Юлі, дык усё роўна гэта былі вершы, прысвечаныя ёй.

**— А чаму не ставілі прысвячэнняў?**

— У той час гэта было не надта прынятае. Нават калі пазней я захацеў прысвяціць Юлі кнігу «Пяшчота», дык высокае начальства з Камітэту па друку зняло прысвячэнне.

**— Дарэчы, спадарыня Юлія расказала, што гэта яна падштурхнула вас да напісання «Пяшчоты», гаварыла, у прыватнасці: «Генадзь заўсёды пісаў вершы пра каханне, але яны былі раскіданыя па розных кнігах. «Зрабі зборнік, — прасіла я, — пакуль яшчэ свежае ў цябе гэтае пачуццё...»**

— Мабыць, так. Хоць я і сам пра такую кнігу думаў. Гэта ж была пара «брэжнеўскай публіцыстыкі» ў паэзіі. І вось якраз у той час мой сябра Дзмітро Паўлычка выдаў цэлую кніжку пра каханне — «Таямніцы твайго аблічча». Яна мне вельмі спадабалася, і я такім чынам, падахвочаны Дзмітром і Юляй, склаў «Пяшчоту». Дарэчы, спадзяваўся, што кніжка мая нейкім чынам падахвоціць і сяброў — тага ж Рыгора Барадуліна, Янку Сіпакова — напісаць нешта падобнае. Я ж бачыў, што ў той паэтычнапубліцыстычнай тарабаршчыне, якая тады ўсё запаланіла і ў якой і мы часамі прымалі ўдзел, страчваецца ўвага і павага да паэзіі, а інтымнай лірыкай гэтую ўвагу і павагу можна заваяваць. Маладосць ёсць маладосць, юнакам патрэбныя, акрамя ўсяго іншага, вершы пра каханне... Мой сябра расказваў, як ён ачмураў сваю дзяўчыну маімі вершамі, не прызнаючыся, што гэта не ягоныя... Улады прыходзяць і адыходзяць, а каханне было і будзе. І вершы пра каханне таксама застануцца, калі яны, канешне, таленавітыя. Ну, а хто натхняе на такія вершы? Дзяўчаты і жанчыны. Мой першы натхняльнік — Юля.

**— Ці будзеце неяк адзначаць юбілей, калі дактары пусцяць Вас дадому?**

— Канешне, мы з Юляй збіраліся яго адзначыць — разам з дзецьмі, з унукамі, з найбліжэйшымі сябрамі. Я нават выдам такі сакрэт, пра які Юлі яшчэ не гаварыў. Справа ў тым, што калі мы распісаліся, Мікалай Матукоўскі, які быў сведкам з майго боку і які ў той час ужо працаваў у «Звяздзе», на правах старэйшага павёў нас адзначыць падзею ў пельменную, якая знаходзілася там, дзе цяпер «Макдональдс». І вось Мікалай узяў бутэльку балгарскай «Гымзы» і па дзве порцыі пельменяў. Для нас гэта быў шык — дзве порцыі!.. Дык цяпер мы «Гымзу», можа, і не знойдзем, але разам з рознымі закускамі я хацеў паставіць на стол пельмені. Як і пяцьдзесят гадоў таму.

**Віншаванне ад Рыгора Барадуліна:**

Чароўная Юля і мудры Генадзь,
Ад гэтага юбілею
Яшчэ два дзесяткі гнаць,
Хай чорная зайздрасць шалее.
Лагоды і згоды
Вам назаўсёды!

* * *

— Ужо не прыгадаю, як пазнаёміліся, — кажа **Юлія Бураўкіна**. — Генадзь памятае, што заўважыў мяне ў чарзе ў буфеце. Я ж не звярнула на яго ўвагі. Кахання з першага позірку ў нас не было, хаця, канешне, Генадзь захапіўся мною і нават вершы чытаў са сцэны. Мне, канешне, гэта было прыемна. Праўда, пасля мяне смехам так і называлі — «дарагая, нецалаваная»... Генадзь і тады вылучаўся сярод іншых: у яго ўжо была беларуская ідэя, ён шмат чытаў — значна больш, чым я, хаця мы ўсе тады чыталі, бо вучыліся на філфаку, але я і да вучобы ва універсітэце чытала ўсё, што можна было і чаго нельга, перапісвалі ад рукі Ясеніна... Зблізіла ж нас ягоная хвароба. Я была абсалютнай дзяўчынкай, маладой і нявопытнай, якая і жыцця не ведала. І вось я не змагла яго пакінуць. Я адчувала, што павінна падтрымаць яго... Тры месяцы ляжаў Генадзь у бальніцы. Пра гэта не ведала нават мая мама, а калі б даведалася... Яна і так не хацела, каб я рана выходзіла замуж. Але лекар сказаў: «Дзяўчынка, калі хочаш мець мужа, дык павінна яго добра карміць і даглядаць...» Калі ён сказаў такое, я зразумела, што не маю права пакідаць Генадзя.

**— Такім чынам той доктар усклаў на вас адказнасць за яго здароўе і жыццё?**

— Так, напэўна, гэта была адказнасць... Дарэчы, пасля Генадзь вылечыўся да такой ступені, што ў яго ні разу не было рэцыдыву... Вось гэтая гісторыя вельмі зблізіла нас. Мне тады было 19 гадоў...

**Юбіляраў распытваў Сяргей Шапран**

**Аляксандр Фядута** піша пра дзяржсакратара Рады бяспекі **Юрыя Жадобіна** — у цыкле «Палітбюро–2009».

# Генерал мірнага часу



**Юры Жадобін**

нар. у 1954 у Днепрапятроўску. Ва Ўзброеных сілах — з 1972. У 1976 скончыў Казанскую вышэйшую танкавую камандную вучэльню, у 1985 — камандны факультэт Вайсковай акадэміі бранятанкавых войскаў у Маскве. Генерал–маёр.

Ад 1976 да 1990 прайшоў усе пасады ад камандзіра ўзводу да камандзіра палка. У 1990—1999 служыў на камандных пасадах у сістэме Грамадзянскай абароны Беларусі, унутраных войсках МУС. Ад 1999 займаў пасаду намесніка міністра ўнутраных спраў — камандуючага ўнутранымі войскамі. У 2003 стаў кіраўніком Службы бяспекі прэзідэнта. У ліпені 2007 прызначаны старшынём КДБ. З ліпеня 2008 — дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі.

— Куды павяртаць?

Таксіст вёз мяне дахаты. Я спазняўся.

— Павярніце лепш вось тут, каля Педагагічнага універсітэту. Да... — я задумаўся, бо не ведаў, ці зразумее мінскі кіроўца, мала абазнаны ў асаблівасцях палітычнага жыцця, калі я назаву будынак Службы бяспекі прэзідэнта.

— ... да «дому Жадобіна»? — удакладніў ён.

## Два танкісты

Юры Жадобін — прафесійны вайсковец, выпускнік Казанскай вышэйшай танкавай вучэльні. Прайшоў усе прыступкі да камандзіра палка. У 1990 г. асеў на ціхай сталічнай пасадзе ў сістэме Грамадзянскай абароны Беларусі. Там, дзе менавіта ў гэты час служыў яшчэ адзін прафесійны ваяка — Юры Сівакоў. Той самы.

Розніца ва ўзросце паміж генераламі — восем гадоў (Жадобін нарадзіўся ў Днепрапятроўску ў 1954 г., Сівакоў — на Сахаліне ў 1946 г.). Істотная розніца. Вайскоўцы з старэйшымі па званні рэдка сыходзяцца на кароткай назе. Але вось старэйшыя часам «цягнуць» малодшых.

Тут сімпатыя была б цалкам апраўданая. Абодва — танкісты. У нас няма дадзеных, што старэйшы спрыяў малодшаму, аднак ёсць колькі супадзенняў у датах. Так, у 1999 г. Сівакоў сыходзіць з пасады намесніка міністра — камандуючага ўнутранымі войскамі і становіцца міністрам унутраных справаў. А яго на пасадзе ў Мінабароны мяняе Юры Жадобін. У 2003 годзе Сівакоў у трэці раз вяртаецца ва ўладу ў якасці міністра спорту і турызму. І ў тым жа 2003 г. Жадобіна прызначаюць начальнікам Службы бяспекі прэзідэнта.

## Целаахоўнік

Не чэкіст, не міліцыянер. Вайсковец. Пакольні ўсе структуры «палітычнага вышуку» мірна блукалі з ведамства ў ведамства разам з непатапляльным да часу Віктарам Шэйманам, ператварыўца ў беларускую версію Каржакова Жадобін проста не меў шанцаў. Ён і засяродзіўся на забеспячэнні фізічнай бяспекі вышэйшых асобаў беларускай дзяржавы і членаў сям'і прэзідэнта.

Але вайсковая дысцыпліна, якой ён змусіў трымацца злёгку падзабылых пра яе «ахоўнікаў цела», менавіта і спарадзіла гэтую самую назву «офіса» Службы бяспекі прэзідэнта — «дом Жадобіна» — па аналогіі з «домам Паўлава» ў Сталінградзе.

Менавіта тады ён і пазнаёміўся з Віктарам Аляксандравічам Лукашэнкам, якога ў 2005 годзе прызначылі памочнікам кіраўніка дзяржавы па пытаннях нацыянальнай бяспекі.

Прызначыць на любую ключавую пасаду ў нашай краіне і пінгвіна можна. Але пінгвіна працаваць не прымусіш. А Віктару трэба было навучыцца працаваць хутка і эфектыўна, бо галоўным крытыкам яго, паводле свайго статусу, зрабіўся яго папярэднік на гэтай пасадзе — «Віця вялікі», сам Шэйман. І калі чыноўніцкай мудрасці яго мог навучыць Уладзімір Макей, дык мастацтва кантролю за сілавікамі выкладаў менавіта Жадобін. Балазе, той і армейскія пытанні, і пытанні МУС зведаў на ўласнай скуры, а дзейнасць КДБ да часу была выведзеная за межы кампетэнцыі «Віці малога». Яго варта было мець на ўвазе, але кадры расстаўляць да часу «малому» не дазвалялі. Трэніраваліся, як гаварылася ў вядомым савецкім фільме, на кошках.

## Прыклад для наследавання

Хоцькі-няхоцькі Жадобін пачаў гуляць у той камандзе, цэнтрам прыцягнення ў якой стаў Віктар Лукашэнка. І гэта быў неацэнны набытак каманды «ваўчанятаў».

Вымушаныя супрацьстаяць Шэйману ў апаратнай барацьбе (нічога асабістага, проста кожны даводзіць уласную эфектыўнасць: сакратар Рады бяспекі і памочнік па нацыянальнай бяспецы, а значыць, і іх апараты, і «групы падтрымкі»), «ваўчаняты» мелі патрэбу ў чалавеку, які выклікаў бы давер у Лукашэнкі-старэйшага і ў чалавечым, і ў прафесійным плане. Бравы генерал Жадобін не інтрыгаваў, а служыў, не рас-



Юры Жадобін — прафесійны танкіст.



Цяпер у беларускім войску такога абутку не носяць.

стаўляў «сваіх людзей», а выконваў загад. І Лукашэнка-бацька, стомлены ад вечнай незаменнасці Шэймана, разглядаў начальніка сваёй Службы бяспекі як чалавека, на якога можна спадзявацца — у выпадку чаго.

А для Віктара Лукашэнкі Жадобін стаў мадэллю паводзінаў. Такі вось просты, спакойны, вясёлы — гэтаму не навучышся, затое можна павучыцца шмат чаму іншаму. Вайсковаму. Не апранеш жа маршальскі мундзір, калі нават не генерал. А Жадобін — сапраўдны генерал-маёр (не Шэйман, якога проста называлі за вочы «Юрыем Гагарыным беларускага войска»). Тата быў прэзідэнтам — так што «бацькам» для Віктара мог стаць менавіта Жадобін. Малодшыя цягнуцца да старэйшых, гэта натуральна.

Не ведаю, ці многаму паспеў навучыцца Віктар Лукашэнка ў Юрыя Жадобіна. Але ў той момант, калі шэйманаўская крэатура — Сцяпан Сухарэнка — канчаткова скампраметаваў сябе на пасадзе старшыні КДБ у вачах прэзідэнта, Жадобін, які ніводнага дня не служыў да гэтага ў «канторы», раптоўна яе ўзначаліў.

## «Чысцільшчык» аўгіевых стайняў

Сухарэнка пакінуў па сабе вясёлую «спадчыну» ў выглядзе анекдотаў аб збіцці старшыні Камітэту дзяржкантролю перапранутымі «чэкістамі», аб дохлым пацуку ў вядры апазіцыі і некалькі незакрытых крымінальных справаў супраць высокіх чыноў КДБ. Самі чэкісты перыядычна арганізоўвалі «выкіды» скандальнай інфармацыі пра сваё ведамства праз зарэгістраваныя ў расійскім сектары інтэрнэту «беларускія» сайты. І Жадобіна накіравалі на месца «генерала Сцёпы» наводзіць парадак. Ён узяўся за гэтую справу з усёй салдацкай гарачнасцю і, кажуць, ледзьве не з матам.

КДБ Беларусі — гэта пры Лукашэнку такое гіблае месца, куды кожнага наступнага старшыню прызначаюць, каб навёў парадак пасля папярэдняга. Пра Жадобіна напэўна вядома, што за кароткі час знаходжання на гэтай адказнай пасадзе ніякіх скандалаў не адбылося. І некалькі крымінальных справаў, пачатых да яго прыходу супраць былых паплечнікаў генерала Сухарэнкі, дайшлі да лагічнага канца. У тым ліку — па тых фігурантах, якія падчас выбараў 2006 году неабачліва паставілі на Казуліна.

Нічога не зробіш. Служба. Як сказаў бы, верагодна, сам Жадобін — «нічога асабістага». Не падстаўляйцеся. Не парушайце. Можа, пакінем у спакоі.

## Даслужыўся

Астатняе было справай выпадку — ці справай тэхнікі. Выбух, які адбыўся ў ліпені 2008 г., у непасрэднай блізкасці ад трыбуны, на якой звычайна стаяла першая асоба беларускай дзяржавы, канечне, нічым не мог пашкодзіць гэтай першай асобе. Але першая асоба хутка прыбыла на месца здарэння і гэтак жа хутка прызначыла іншых асобаў адказнымі за ўсё, што адбылося. Па чыстай, верагодна, выпадковасці адказнымі сталі кіраўнік Адміністрацыі Генадзь Невыглас і сакратар Рады бяспекі Віктар Шэйман, у чые непасрэдныя абавязкі прадухіленне падобных выбухаў чамусьці не ўваходзіла. Ацалеў — да часу — міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў, які паабяцаў расследаваць справу, адная не вынес яе цяжару і сышоў на заслужаны адпачынак.

Таксама ацалеў і нават атрымаў падвышэнне старшыня КДБ Юры Жадобін. А тое, што злыя языкі пагаворвалі, што яго, маўляў, ведамства ўсё гэта і арганізавала, дык на тое і злыя языкі. Я дык перакананы, што «наш» Камітэт не меў да здарэння ніякага дачынення. Пра органы бяспекі іншых брацкіх і нават у нечым саюзных краінаў нічога сказаць не магу.

Адзінае, што сказаць можна пэўна, — з сыходам Шэймана ўтварылася вакансія, якую трэба было запоўніць. І вось ужо генерал-маёр Юры Жадобін стаў дзяржсакратаром Рады бяспекі. Радзіма загадала. Прозвішча Радзімы называць не будзем.

Так «ваўчаняты» атрымалі кантроль над асноўнымі прэзідэнцкімі і сілавымі ведамствамі, улічваючы паталагічны нейтралітэт Леаніда Мальцава і гатоўнасць да хаўрусу з імі тагачаснага галоўнага «мянта» Навумава.

## Нічога страшнага

Так Аляксандр Лукашэнка ў другі раз у жыцці — пасля панавання дуэта «Шэйман — Сухарэнка» — апынуўся ў сітуацыі, калі ўсе інфармацыйныя плыні замыкаюцца на адну групу, якая фактычна ператварылася ў рэгенцкую раду пры кіраўніку. Аднак на гэты раз адрозненне вельмі істотнае.

Аніводны з членаў групы нічым не паспеў скампраметаваць сябе ні ў вачах беларускай грамадскасці, ні ў вачах Захаду. Яны не нясуць адказнасці ні за знікненне палітычных апанентаў, ні за іх арышты і збіццё дубінкамі. Ну не звязваецца ўсё гэта з Жадобіным. Адзіным ляпсусам было ягонае выказванне пра «1767 дэструктыўных элементаў». Ідэю збліжэння з Еўропай сябры новай групы агучылі паспяхова (у тым ліку і асабіста Жадобін, на што звярнулі ўвагу ўсе). І ўсё гэта значыць, што Еўропа з імі — з Макеем, з Пяткевіч, з Жадобіным — размаўляць будзе. А значыць, і з Аляксандрам Лукашэнкам — будзе.



Жадобін трапляў на адны здымкі з Паўлічэнкам, але не больш за тое.

І другое. Пранікненнем у найвышэйшыя сферы ўлады яны абавязаныя асабіста прэзідэнту. А таму будуць служыць добрасумленна. Але ні ён не з'яўляецца іх закладнікам, ні яны — ягонымі. Не звязваюць іх супольныя, рэальныя ці ўяўныя, злачынствы. Гэта не банда, не клан. Звычайная палітычная групоўка, якая існуе ў кожнай краіне. І развівацца адзін з адным — як калі-небудзь і з уладай — гэтыя людзі будуць без істэрык і выкрывальніцкіх інтэрв'ю.

Менавіта таму Лукашэнка ўпершыню адчувае сябе спакойна. Калі б яшчэ не эканамічныя праблемы, можна было б і наогул не хадзіць на працу. Механізм дзяржаўнага кіравання функцыянуе, вінцікі круцяцца, рычагі рухаюцца, а ўласнага твару, які б кампраметаваў сваёй блізкасцю першы твар улады, ужо няма ні ў кага.

Жадобін тут — абсалютны пасказнік эвалюцыі рэжыму. Яго нібы спецыяльна паставілі на гэтае месца, каб аналітыкі задалі сабе пытанне: а гэта, наогул, хто? Пра Сівакова вядома было ўсё: і як на паседжанні вышэйшых органаў з'яўляўся ў крапавым барэце, і як іспыты асабіста прымаў, і што ў віцэ-прэм'еры цягнуўся. А Жадобін? Што мы, наогул, ведаем пра Жадобіна?

## Генерал

Мне распавядаў чалавек, які сустракаўся з Жадобіным у афіцыйнай абстаноўцы. Яго прыняў дзяржаўны чыноўнік высокага ўзроўню, дастаткова разумны, каб разумець, што дзяржава — гэта не ён асабіста. Трымаўся спакойна, прыязна. Выслухаў. Паабяцаў прыняць рашэнне. Ніякай шматзначнасці, ніякіх насупленых броваў. Нават пасміхаўся. І з задавальненнем адрэагаваў на зварот «таварыш генерал». А што? Даслужыўся ж. Кепскі той жаўнер, які не хацеў стаць генералам. Жадобін вось стаў. Можа ганарыцца.

Наша сістэма закрытая настолькі, што сваёй закрытасцю здольная спалохаць любога слабанервовага. Танкіст у генеральскіх пагонах, уся біяграфія якога зводзіцца да паслужнога генерал-маёрскага спісу, — ды пра гэткае пасля Шэймана толькі марыць можна было!

На ўсіх фатаграфіях, дзе мне даводзілася бачыць Жадобіна, у яго альбо адпаведны выпадку сур'ёзны выраз твару (на службе, значыць), альбо ўсмешка. Часамі нават смяецца. Уявіце сабе, каб рагатаў Шэйман ці Латыпаў нават. Немагчыма.

Я не кажу пра тое, што чалавек, які смяецца, абавязкова добры палітык. Але спіць ён дакладна спакойна.

**Аляксандр Фядута, спецыяльна для «НН»**



Генерал сярод цывільных. Злева — старшыня Падліковай палаты Расіі Сяргей Сцяпашын, справа ад Жадобіна — тагачасны старшыня Камітэту дзяржкантролю Анатоль Тозік.

**Раней у цыкле «Палітбюро-2009»:**

«Уладзімір Макей. Другі твар» № 14

«Наталля Пяткевіч. Русалка на аблоках» №16

Наступная публікацыя цыклу будзе прысвечаная памочніку прэзідэнта па пытаннях эканомікі Сяргею Ткачову.

## Да чаго мы дайшлі, народ?

За адзін дзень мяне тройчы спрабавалі падмануць.

Учора ў аўтарамонце мяне пры разліку спрабавалі падмануць на 17 тысячаў! Учора ж я выявіў, што работнікі — я будую дом — спрабавалі вывезці з будоўлі частку мяхоў з цэментам. Паставілі б хату на пяску… Гандлярка на вуліцы Маякоўскага спрабавала аблічыць мяне на паўтары тысячы, калі я купляў яблыкі з бананамі… І гэта за адзін дзень!

Беларусы, трэба нешта рабіць! Так працягвацца не можа! Да чаго мы дайшлі, народ? У чым першапрычына?

**Андрэй, Мінск**



### Пясчаная бура

**У Беларусі стаіць незвычайная сухмень. Дажджу не было з пачатку красавіка і, паводле сіноптыкаў, не чакаецца да сярэдзіны мая. Рунь не ўзнімаецца, гаспадары асцерагаюцца садзіць бульбу ў груддзе. Вецер падымае над голымі палеткамі пясчаныя буры. У такую завіруху ля вёскі Кухты на Случчыне трапіла фотакарэспандэнтка «НН» Юлія Дарашкевіч.**

## Паратунак — у развіцці прыватнай уласнасці

**Як бы ні было цяжка, у нас, у Заходняй Беларусі, пасля вайны на чыгуначныя станцыі прывозілі коньмі збожжа (на падатак) столькі, што не паспявалі вывозіць вагонамі. Сам вазіў і бачыў.** Такі быў энтузіязм, калі сялянам раздалі панскую зямлю. Але не доўга музыка іграла. Сістэме не патрэбныя свабодныя працаўнікі (а кантракты сёння для чаго?). Абклалі грабежніцкімі падаткамі, абклалі грашовым зборам дрэвы, вуллі і нават хатнюю птушку. Людзей пазбавілі гападаркі і энтузіязму ў працы. Трымалі ў калгасах як маглі: не давалі пашпарту. Не дапамагала: хто ішоў у войска, у калгас не вяртаўся. Завярбоўваліся ў Данбас, у Мінск на будаўніцтва заводаў і нават у Варкуту на шахты.

Выраслае ў калгасе пакаленне не прывучанае добрасумленна працаваць, співаецца. Спрыяе палітыка нізкіх цэнаў на алкаголь. Параўнайма цану «бармутухі» і мяса. Вось чаму ў Беларусі такая малая працягласць жыцця ў мужчынаў.

Кіруючы клан не можа адмовіцца ад прыгону і запалохвання, каб толькі захаваць уладу. Яскравы прыклад — будаўніцтва аграгарадкоў. Гэта робіцца, каб сканцэнтраваць жывёлагадоўлю, птушкагадоўлю ў комплексах-гігантах, дзе працуюць сотні работнікаў па кантракце, за якімі наглядаюць дзясяткі спецыялістаў-прыганятых.

Гучаць песні аб вялікіх намалотах і літрах надоенага малака, але сабекошт прадукцыі і рэнтабельнасць у калгаснай гаспадарцы ні адзін чыноўнік-агітатар не асмеліцца агучыць. Напрыклад, два калгасы ў Баранавіцкім раёне аддалі на шэфства Жабінкаўскаму цукроваму заводу, які «ганяе» тэхніку на работу за 200 км. І такіх прыкладаў мноства.

Яшчэ аб чым маўчаць пеюны-прапагандысты адраджэння сяла —жудасна атручаная хімікаліямі глеба, вада і паветра вакол страшылішчаў-комплексаў.

Гучаць песні аб вялікіх намалотах і літрах надоенага малака, але сабекошт прадукцыі і рэнтабельнасць у калгаснай гаспадарцы ні адзін чыноўнік-агітатар не асмеліцца агучыць. Напрыклад, два калгасы ў Баранавіцкім раёне аддалі на шэфства Жабінкаўскаму цукроваму заводу, які «ганяе» тэхніку на работу за 200 км.

Напрыклад, у маім калодзежы, і не толькі ў маім (а гэта вёска Русіны, дзе размешчаная птушкафабрыка), вада ўтрымлівае нітратаў у тры разы болей за норму! Не лепшая і бульба. Якое ж тут адраджэнне, калі неўзаметку труцімся?

Выйсце — яно ў руках сумленных людзей і самаахвярнай інтэлігенцыі. Як Колас пісаў: «Набыць зямлю, прыдбаць свой кут, каб з панскіх выпутацца пут». Без адраджэння сялянскіх гаспадарак Беларусь не будзе мецъ будучыні як дзяржава. Вось на што трэба траціць замежныя крэдыты. А не на АЭС, якая ў канчатковым выніку сябе не акупіць і загубіць навечна 3000 га ўраджайнай зямлі.

**Вячаслаў Сухарэбскі, Русіны (Баранавіцкі раён)**

## Пра каробкі для тортаў

**Колісь тарты прадавалі ў ашатных кардонных каробках.** Цяпер замест іх — у пластыкавых. Прычым у нас у Берасці яшчэ і бяруць за такую каробку 1600 рублёў звыш цаны торта. А пластык жа засмечвае прыроду. Чаму адмовіліся ад кардонных пушак?

**Віктар Сачык, Берасце**

## Якую культуру яна прадстаўляе?

**Давялося мне прысутнічаць на справаздачным паседжанні аддзелу культуры Аршанскага гарвыканкаму.** Не буду пісаць, як за дзве з паловай гадзіны людзі ўставалі і сыходзілі, стаміўшыся ад балбатні. Мяне ўразіла, што загадчыца аддзелу культуры Мігаль не вымавіла ніводнага слова па-беларуску. Якую культуру яна прадстаўляе? А яшчэ больш смешна было слухаць, як дэпутат выказваў ёй удзячнасць за вялікі «вклад в белорусскую культуру». Краіна цудаў і парадоксаў!

**Генадзь, Ворша**

## Каго пабілі ля Пераходаў

**Штогод не адна тысяча наведнікаў Слуцкага гісторыка-краязнаўчага музею спыняецца ля дыярамы «Бой ля вёскі Пераходы», на якой мінскі мастак Л.Асядоўскі адлюстраваў адзін з найболей удалых, як лічыцца, баёў партызанскай брыгады імя Фрунзе 19 красавіка 1944 г.** Што мы бачым на той дыяраме? На дарозе яркім полымем гарыць нямецкі грузавік, ляжаць трупамі нямецкія салдаты ў касках, а вакол іх з аўтаматамі ППШ вядуць агонь партызаны. На заднім плане ахопленая полымем вёска Пераходы, якую, як сведчыць кніга «Памяць» Слуцкага раёну, карнікі спалілі разам з жыхарамі 23 лютага 1943 году.

…14-гадовы Рыгор у тым баі не ўдзельнічаў: камандзір не дазволіў. А бацька, камісар атраду, пасля бою паведаў яму сам-насам цікавыя факты. Калі партызаны кінуліся ў контратаку, натыкнуўся на двух салдатаў у шэрай форме, якія ляжалі за кулямётам. Адзін з іх, мужчына сярэдніх гадоў, закрычаў немым голасам камісару: «Братачка, не страляй, нас немцы мабілізавалі. Мы не паліцаі, мы бэкоўцы, я па вас не страляў!»

Ад 21 сакавіка 1944 немцы, прадбачачы непазбежны адыход на Захад, сталі арганізоўваць Беларускую краёвую абарону для барацьбы з партызанамі. Пачалі прымусовую мабілізацыю мужчынаў сярэдняга ўзросту, нават сямейных, дзеля чаго праводзіліся і начныя аблавы на вёсках. З нашай вёскі туды зацуглялі двух мужчынаў, з суседніх — таксама.

Такіх «бэкоўцаў» у казармах на тэрыторыі 14-га вайсковага гарадку на ўскраіне Слуцку набралі звыш 500 чалавек. Хутчэй за ўсё з імі і сутыкнуліся партызаны ля Пераходаў. Ці не таму яны страцілі толькі аднаго чалавека і не мелі ніводнага параненага?

**Міхась Тычына, Слуцк**

ВОДГУК

## Няхай драбніца не ўзбуйніцца: цеста раскачваюць, а не раскатваюць

**У рубрыцы «Моўныя драбніцы» («НН» №13'2009) Анатоль Сідарэвіч слушна лічыць, што, калі маецца на ўвазе дзяржава і краіна, трэба пісаць: у Беларусі (як і ва Украіне).** Аднак пытанне сфармулявана занадта катэгарычна: «На Беларусі ці ў Беларусі?» Ёсць канктэксты, у якіх на сваім месцы спалучэнне «на Беларусі»:

Да сягоння жыве памяць
Аб злым гэтым дусе
На ўсёй чыста Украіне
І на Беларусі. (Я.Купала)

На Беларусі ён не марна жыў.
(У.Дубоўка)

На Беларусі Бог жыве.
(У.Караткевіч)

А.Сідарэвіч таксама звярнуў увагу на пашыраную памылку пры ўжыванні формаў ступеняў параўнання прыметнікаў і прыслоўяў у сказах тыпу: «Чым танчэй (трэба: танчэйшы) лёд, тым больш на яго хочацца». На жаль, прыводзячы сказ-ілюстрацыю, ён дапусціў недагляд: «Маня (дзякуй за беларускае імя! — А.К.) раскатала цеста тонка...» Шкада, мы забываемся, як у маленстве «раскатвалі» санкі, каб далей яны ўжо імчалі самі. А сёння, бывае, не заўважаем, як нашы гаспадыні «раскачваюць» цеста.

Будзьма сачыць, каб выкараненне адной хібы міжвольна не цягнула за сабою іншых, не менш прыкрых.

**Алесь Каўрус, Мінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу.
Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

Збяры Кнігарню «Наша Ніва»



















ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ



Гэтае палатно, напісанае алеем, памерам 170х260 см на аўкцыёне DA Rempex у Варшаве прадалі за 150 000 злотых (на той момант 47 тыс. даляраў). Карціна паходзіць з «шведскай серыі» мастака, якая паўстала ў прыморскім мястэчку Варнэнас пад уражаннем камяністага марскога ўзбярэжжа. Тарасевіч быў запрошаны туды на пленэр на лета 1985 году. Твор пэўны час, ад пачатку 1990-х, належаў лідэру групы Roxette Пэры Гесле.

# Цана мастацтву

Беларус з Падляшша Лёнік Тарасевіч увайшоў у дзесятку самых дарагіх мастакоў Польшчы 2008 году.

«Аматараў сучаснага мастацтва не бракуе. Доказам гэтага з'яўляюцца сумы продажаў на аўкцыёнах», — піша польскі партал «Inwestycje». Паводле звестак выдання, беларус Лявон Тарасевіч увайшоў у дзесятку мастакоў, чые працы былі найдаражэй прададзеныя з аўкцыёнаў у Польшчы і за мяжой. Што адбываецца на аналагічным рынку ў Беларусі?

Мастачка Зоя Луцэвіч прызнае, што аўкцыённы рух у Беларусі амаль адсутнічае. «Прыязджаюць замежныя агенты, цікавяцца мастакамі і карцінамі, але на гэтым усё часцей і спыняецца. І так адбываецца не таму, што ў нас няма вартых», — кажа яна.

«Арт-рынак існаваў заўсёды, але не ў нас. Але зараз мы хацяб ведаем гэтае слова, — адгукаецца мастак Валянцін Губараў. — У Еўропе існуе жорсткая сістэма: мастак-галерэя-кліент. У нас куплянне карціны — гэта рызыка і густаўшчына. Наш чалавек, які набывае карціну, часцей за ўсё разважае так: прыгожа, а таксама вельмі пасуе да шпалераў і гардзінаў», — кажа мастак.

Але не толькі ў малой колькасці галерэяў палягае праблема беларускага арт-рынку, лічыць Валянін Губараў: «Няма крытыкаў і мастацтвазнаўцаў. Нашыя крытыкі вельмі добрыя: альбо хваляць, альбо нічога не кажуць. А галоўнае, няма людзей, якія разумеюць, што мастацтва каштуе вялікіх грошай».

У якасці прыкладу таго, што мастацтва ў сённяшні крызісны час — самы надзейны аб'ект інвестыцый, Валянцін прыгадаў нядаўні выпадак з продажам карціны Маціса, якая належала вядомаму французскаму мадэльеру Іву Сен-Ларану: «Быў у яго шыкоўны дом на 1,5 мільёну даляраў. А вісела ў гэтым доме карціна Маціса, пра якую ніхто не ведаў, і яна была прададзеная за 32 мільёны даляраў. З мастацтвам законы часу дзейнічаюць у процілеглым кірунку — мастацтва з часам толькі даражэе».

Карціны Валянціна Губарава, якія ўпершыню прадставіў на сваіх таргах самы вядомы Аўкцыённы дом «Christie's», атрымалі самую высокую ацэнку экспертаў. Пра свой аўкцыённы вопыт Валянцін распавядае так: «Гэта быў агульны праект аўстрыйцаў, у якіх былі грошы. Хтосьці ім сказаў, што на карцінах можна добра зарабіць. А ў Беларусі мастакі проста сядзяць на вуліцах і гатовыя прадавацца адносна танна. Абедзве мае працы, якія трапілі на аўкцыён, былі прададзеныя. Карціна «Аглядальнік», якая аказалася самай дарагой на тых таргах, была нават змешчаная на вокладцы каталогу аўкцыёну».

Што да Лявона Тарасевіча — яго думкі наконт галерэяў і арт-рынку досыць лаканічныя: «Мяне гэта не цікавіць, аўкцыёны працуюць па-за мной». І гэта нягледзячы на тое, што, паводле звестак парталу «Inwestycje», у 2007—2008 гадах дзве яго працы былі прададзеныя на аўкцыёнах у Варшаве і Стакгольме за 47 і 44 тысячы даляраў.

**Алена Скорабагатава**

**Лёнік (Лявон) Тарасевіч**

(нар. 1957, станцыя Валілы, блізка Беластоку). Беларус з Падляшша. Актыўна ўдзельнічае ў нацыянальных арганізацыях беларусаў, адзін з арганізатараў фэсту беларускага року «Басовішча». Жыве на роднай станцыі Валілы, гадуе на сваёй сядзібе мноства экзатычных птушак. Выкладае ў Варшаўскай Акадэміі мастацтва. Выставы Тарасевіча адбываліся ў Варшаве, Нью-Ёрку, Мілане, іншых гарадах.

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Чатыры стагоддзі беларускай вакальнай музыкі

West Records, 2009




Абсяг матэрыялу — неверагодны.

Уся моц айчыннай вакальнай музыкі ў гэтым дыску. Пяюць тэнар Юры Гарадзецкі, які два гады таму трапіў у пяцёрку найлепшых на 78-м міжнародным конкурсе імя каралевы Лізаветы, ды сапрана Алена Золава. Абсяг матэрыялу — неверагодны: ад канцоны з «Полацкага сшытку» да твораў Лучанка. Чысцютка ліецца голас спевакоў, музыка толькі дадае штрыхі (акампанімент — адно фартэпіяна).

Пераварыць за раз такую музычную аграмадзіну немагчыма. Дыск мае сэнс слухаць парцыянальна — па стагоддзях. Тэматычна яго можна падзяліць на дзве часткі: лірычная — з сэрэнадамі, канцонамі, рамансамі ды фантазіямі і духоўная — з псалмамі і галашэннямі. Творы, якія заслугоўваюць асобнай увагі: Арыя Фаўста (у перакладзе Сёмухі), «Старая песенька» Напалеона Орды і, вядома ж, «Зорка Венера».

### Песняры

Спадчына, West Records, 2008




Падкіслілі б трохі «Мой родны кут» — зусім бы па-іншаму выглядала.

«Песняры» — як яны ёсць. Шматгалоссе, меладычнасць, распеўнасць, пазнавальнасць... Цяперашні склад дзяржаўнага ансамблю перапяяў і перазапісаў найлепшае з створанага для «Песняроў» Ігарам Лучанком. У альбом гарманічна ўпісаліся і дзве новыя песні: «Вандроўная пташка» і «Смех дзявочы». «Смех», пэўна, самая жывая песня гэтай складанкі, адчуваецца ў ёй тая самая «песняроўская» энергетыка часоў «Перапёлачкі». Іншыя нумары падаюцца нейкімі застыглымі і безаблічнымі. Відаць, ад боязі музыкаў папсаваць класічны матэрыял. Старыя хіты прычасалі да такой ступені, што яны наогул ніякіх эмоцыяў не выклікаюць: бубны прыглушылі, загасілі гітару, прыбралі рэзкасць скрыпкі, не засталося і намёку на арт-рок. Цяперака «Песняры» дэманструюць толькі вакальную моц (яна, натуральна, ого-го), але не інструментальную і тым больш не музычную прасунутасць. А во псіхадэлу дадалі б у гэтыя песні-пастаменты, ну гітарай там пабзынькалі б у «Вераніцы», далі б «кайзер чыфсу» ў «Дзяўчыначцы» або падкіслілі б трохі «Мой родны кут» — зусім бы па-іншаму выглядала. І тады гэты дыск можна было б назваць патрэбным і цікавым.

### DяDя Vаня і One Hell Thing

The Best#1, West Records, 2008




«Мая Беларашa» (АНТ-версія)

Тое, што выконвае чарговы ўлюбёнец Пугачовай, можна назваць няўмелым гламурным блюзам з рэзкім пахам піцерскіх закануркаў. Гэта калі хочацца спяваць трывіяльныя словы пад банальныя акорды, а душэўнасці і ўмеласці не стае.

Парасткі адэквату прабіваюцца, як у ціхамірнай баладцы Babylon-блюз, калі хочацца даць веры прынамсі вакальнай харызме, ці ў «Она танцует стрип», дзе намацваецца стылёвасць. Але канчатковы дыягназ дапамагаюць паставіць трэкі «Мая Беларашa» і «Мая Беларашa» (АНТ-версія) — крэольская альтэрнатыва «Я нарадзіўся тут». Пэўна, невылечна хвораму на правінцыяналізм Івану Вабішчэвічу ўсё жыццё наканавана ездзіць цягніком «Піцер-Брэст» (як ён пра гэта пяе).

### Shakespeare-MC

На уровень выше, Глорыя-медыя, 2009




І нават дасціпны бонус па-беларуску «Газу няма» сітуацыі не ратуе.

Калі так пойдзе і далей, 2009 год можна будзе абвесціць годам лёгкай і бяздумнай танцавальнай музыкі. З элементамі рэпу. На пачатку анічога дзіўнага ў Шэйкспіра няма, звычайныя панты нахабніка-дэбютанта. Ціпа, з намі ўсе, рукі давайце ў атмасферу. Танчы, правінцыя, — новы герой ідзе (такі пасыл высвечваецца). Самы харошы трэк па энергетыцы – другі, загалоўны. Далей, Shakespeare-MC з кожным трэкам падае на ўзровень ніжэй. Гэта ўжо дакладна «болей не рэп». Не выйшла Сярогі (ці пародыі на яго) з наступнага трэку пра «VIP-персонаў сельсавету» — надта ўжо тупа глядзіцца. Апяванне начнога клубнага жыцця, што праходзіць чырвонаю ніткаю, можа выклікаць ваніты ў непадрыхтаванага слухача сваёй меладычнай і тэкставай аднастайнасцю. Самых цярплівых пры канцы чакае яшчэ чарговы гімн Рэпу. І нават дасціпны бонус па-беларуску «Газу няма» сітуацыі не ратуе. Стрэл у нікуды. Для тых, каму мала Чука з Гекам.

**Сяргей Будкін**

# Котра. Рака і пушча

**Рай для байдарыстаў, ягаднае шаленства, былое Дайноўскае княства. Піша Сяргей Харэўскі.**



Верхавіны Котры знаходзяцца ў пагранзоне, і для падарожжа трэба браць у памежным штабе адпаведны дазвол.

Рака Котра пачынаецца ў Літве, утварае мяжу Гродзенскага і Шчучынскага раёнаў. А некалі па ёй праходзіў усходні рубеж Дайноўскага княства. Гэтая рака, папулярная ў байдарыстаў, з глыбокімі вірамі, каменнымі перакатамі, невялічкімі вадаспадамі прытокаў — адна з самых маляўнічых у Беларусі. Найбольшы лес Літвы, дзе пачынаецца даліна Котры, называюць Дайноўскай пушчаю, а ў Беларусі — Катранскаю.

Малады заказнік «Котра», аднак, ужо ўключаны ў Сусветны спіс каштоўных водна-балотных ландшафтаў, разам з суседнім літоўскім запаведнікам «Чапкяляй».

Хто бачыць яе ўпершыню — дзівіцца гэтай неўтаймаванай рацэ, непрыступным яе берагам і непралазным лясам навокал. Хто бывае тут не раз — ведаюць, што Котра насамрэч небяспечная. То абваліцца вясною стромы бераг разам з дрэвамі, то павылазяць з дна вялізарныя валуны.

### З Новага Двара на Берышты

Дарога ў Катраншчыну з Астрыны ляжыць праз мястэчка Новы Двор.

Тут захаваўся адзін з найстарэйшых драўляных храмаў Гарадзеншчыны — Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі, што быў пабудаваны яшчэ ў 1749-м. У ім збераглiся цудоўныя старасвецкія аздобы ў стылі ракако. Гэты касцёл ніколі не зачыняўся. У мястэчку захаваліся старасвецкія будынкі, у тым ліку вялікая мураваная сінагога.

Ад Новага Двара можна паехаць на Берышты над возерам (у гэтай вёсцы мае сядзібу палітык Аляксандр Мілінкевіч) ці налева — да Першамайскага. Уласна пушча, дзе бярэ пачатак Котра, пачынаецца акурат за Першамайскам, спрадвечная назва якога — Сабакінцы. Тутэйшы элегантскі касцёл Узвышэння Святога Крыжа пачалі будаваць яшчэ за першымі немцамі, у 1918-м, вежы прыбудавалі ў 1934 г., але да апошняй вайны будоўлю не скончылі. Па вайне з касцёла зрабілі клуб. «Але людзі ў яго не хадзілі. І моладзі забаранялі», — з гонарам кажуць тутэйшыя. Народ пушчанскі, наогул, ганарысты. «Мы тут беларускасць лепей за каго дзяржом. Гэта ў Мінску ніхто па-беларуску не гаворыць. А ў нас — усе! Але й таго, што палякі, не выракаемся».

Аснова гаспадарчае дзейнасці тут для людзей — збор траваў, ягадаў і грыбоў, пчалярства, рыбацтва. Нехта ўпотай гоніць самагонку. Пушча.

### Між дайнавой і крывічамі

За касцёлам стаіць і старая царква, груваcтая і натуральная ў зіхценні сваіх гранітных муроў. Тут, на славянскіх фарпостах перад дайнавой, усходнія хрысціянства мае даўнейшыя карані. Цяперашняя царква ў Першамайскім-Сабакінцах была ўзведзеная з тутэйшага сапраўднага граніту ў 1830 годзе, яшчэ за часоў Уніі. Перад апошняй вайной Сабакінцы палякі было перазвалі ў Нарбутова, у гонар героя паўстання Каліноўскага. А па вайне Нарбутова было перайменаванае ў Першамайск.

Подых пушчы адчуваецца нават у назвах вёсак: Зубрава, Зубраўка, Рыскі, дзе і дасёння збераглiся аўтэнтычныя старадаўнія хаты. Далёка з лесу відаць Зубраўскую гару. Пад ёй добраўпарадкавалі 6-кіламетровую «экалагічную сцяжыну», што пачынаецца за вёскай Рыскі і цягнецца да дзяржаўнай мяжы. Абапал — рэшты першабытных селішчаў, дзюны, брусніцнікі... У Катранскай пушчы расце прынамсі 14 раслінаў, занесеных у Чырвоную кнігу: пальчатакарэннік балтыйскі, зубніца клубняносная, купальнік горны ды іншыя. Тутсама нядаўна знайшлі і рэдкасную мякатніцу адналісную. Усяго ж у заказніку расце 633 віды раслінаў! Рай для пытліўца, асабліва калі ўзяць з сабой у падарожжа вызначальнік флоры.

### Тут друкавалі «Мужыцкую праўду»

Тут, у нетрах Катранскае пушчы, Валеры Урублеўскі ціснуў «Мужыцкую праўду», тут кіпелі баі 1831 і 1863 гадоў. Пра паўстанне Каліноўскага тубыльцы распавядаюць гэтак жыва, нібы тое было на іхняй памяці. Ад праваслаўнай вёсачкі Матылі праз рэчку з самавітай назваю Скарбянка можна дабрацца ў Дудкі. У тутэйшай школцы, збудаванай яшчэ за польскім часам, чвэрць плошчы аддадзеная пад музей паўстання 1863 году... А за полем — ужо Літва.

Котра — унікальная, раздвоеная рака. Спачатку Котра і Вула фармуюць адну раку. Мінуўшы мяжу Беларусі і Літвы, рака разбягаецца на дзве незалежныя рэчкі: Котру — прыток Нёмана, і Вулу — прыток Мерычанкі. Так склалася ў XIX стагоддзі, калі рэчышча Вулы знянацку перасякло водападзел Котры. У выніку два ранейшыя прытокі Котры цяпер належаць да Вулы. Праз тое панізіўся ўзровень грунтавых водаў і амаль зніклі некалькі тутэйшых вялікіх азёраў. Але найбольшае з іх, Бярштанскае, захавалася ва ўсім сваім харастве. Рэха б'ецца ў берагах атачанага лясамі, як сінім ружанцам, возера, нібы ў гарах. У самім мястэчку галоўнай цікавосткаю ёсць старасвецкая царква Параскевы Пятніцы, збудаваная ў 1816-м.

Бярштанскае возера злучанае двума пратокамі з рэчкай Котрай. Праз адну пратоку вада з ракі трапляе ў возера, а праз другую, каля выселку Берастаўіца, вяртаецца ў рэчку.

З Берштаў варта заехаць у Азёры (сядзіба паэта Юрася Пацюпы), мястэчка на беразе прыгожага возера Белае. Цяпер тут ёсць добры аквапарк з саўнамі, на месцы некалі слыннага дзіцячага лагеру «Брыганціна». У мястэчку захаваўся выбітны мемарыял паўстанцам 1863 году. Стаіць таксама старая гранітная царква Святога Духа, а поруч — навюткі касцёл Хрыста Валадара, зграбнай архітэктуры, што імітуе тутэйшае барока.

### Радовішча цукру

У Галавачах давядзецца пераехаць Котру яшчэ раз. Тут яна ўжо зусім шырокая.

Пасля ляжыць Скідаль, часам прысыпаны цукровай пудраю. Тутэйшы цукровы завод займае некалькі кварталаў. Варта паказаць дзецям, з чаго слодычы робяцца. З мільёнаў пыльных буракоў, складзеных у вялізарныя горы!

Блізкасць Гродна заціняе цяпер гэтае мястэчка. Між тым, Скідаль, альбо Скідзель, як яго называюць самі тубыльцы, адзначыў ужо сваё паўтысячагоддзе. Мясцовы парк колішняе сядзібы Антановічаў-Чацвярцінскіх быў закладзены яшчэ ў 1840-я гады. На жаль, да непазнавальнасці панявечылі дзесятак гадоў таму старадаўнюю тутэйшую царкву Міхала Арханёла. Яе бязлітасна абклалі самай няякаснай сілікатнай цэглаю. А калісьці ж тут святарыў найцікаўшы протаіерэй а.Яўген Сянько, мастак-рэстаўратар, які панаўляў абразы на Галіччыне ў 1930-я гады, а па вайне быў рукапаложаны ў святары ў Жыровічах і да пачатку 1952 году тут служыў. Нават сам адліваў званы!

Натуральна, у Скідзелі варта наведацца і ў музей паэта Міхася Васілька. Спыніцца ў Скідзелі варта ў гасцініцы.

Са Скідзеля найцікава спусціцца на байдах уніз па рацэ — бурлівай, порсткай, чыстай, што набірае духу для апошняга рыўка, каб уварвацца ў Нёман. Калі ж вы не аматар экстрыму, то прынамсі праехаць яе левабярэжжам. Берагі тут становяцца ўсё вышэйшымі і вышэйшымі.

У Агародніках Котра ўжо нагадвае рэкі Каўказу — настолькі страсна яна захлёствае россып гранітных валуноў на доўгім перакаце. Доўгачаканы атракцыён для байдарыстаў! А праз кіламетр яна раптоўна ўлятае ў каламутны тут Нёман. У ім вада млявая і цяплейшая, а ў ёй — халодная і бадзёрая.

Пушча адпускае. Нёман запрашае ў падарожжа іншага кшталту.



СЯРГЕЙ МАТАФОНАЎ

**Завуч Дудкоўскай базавай школы Таіса Бялячыц пільнуецца аб музеі героя паўстання 1863 году Людвіка Нарбута.**

**Катранская пушча**

лес у Шчучынскім раёне,
на левабярэжжы Котры. Плошча 12,4 тыс. га. Уздоўж ракі — верасовыя бары, што чаргуюцца з верхавымі сфагнавымі хвойнікамі. Сустракаюцца прыбалотныя чарнічныя ельнікі і бярэзнікі. Ёсць ясянёвыя лясы.

**Котра**

правы прыток Нёмана. Выток паміж вёскамі Парамелі і Казішкі. Даўжыня 140 км. Сярэднегадовы расход вады ў вусці 12,8 мі/с. Амаль на ўсім працягу цячэ праз лес. Рэчышча моцна пакручастае, ніжэй вёскі Агароднікі Шчучынскага раёну на працягу 3 км камяністы перакат. Берагі ў ніжнім цячэнні да 15 м увышкі.

**Раней у рубрыцы «Маршруты»:**

«Край за небакраем, або Беларуская Прусія» (Сапоцкінчына) № 12

«Мяжа Усходу і Захаду» (Жыткавіцкі і Лельчыцкі раёны) №13

«Балдук mon amour» (край Блакітных азёраў) №14

«Мазырскае барока» № 15

«Край белай птушкі» (Асвейшчына) №16.



# Другі Бабруйск

Тэль-Авіву — 100 гадоў. Мала хто ведае, што грамадзянін БНР спрычыніўся да таго, што гэты горад зрабіўся курортам. Піша **Павал Касцюкевіч**.

Калі вы ў прысутнасці ізраільцяніна паспелі ўжо рэкнуць, забыўшыся, што сталіца Ізраілю Тэль-Авіў, а не Ерусалім (чым абавязкова пакрыўдзілі суразмоўца), дык сітуацыю можна выправіць, дадаўшы, што вы мелі на ўвазе сталіцу начнога жыцця і адпачынку.

Гэта святая праўда. Тамтэйшыя бары і дыскатэкі, гіпермаркеты і буцікі абслугоўваюць наведнікаў ад рана да рана. Часткова ў мэтах самарэкламы, але часткова і заслужана ў Тэль-Авіве культывуюць лозунг «горад без перапынку».

### Мястэчка Прымор'е

Менавіта тэль-авіўскі бераг мора найбольш вабіць турыстаў, але першапачаткова Тэль-Авіў быў пабудаваны наогул спінай да мора: большасць вулак, дарма што сумежных, напрасткі не выходзіла да вады, і вокны глядзелі ў адваротным накірунку.

Каб трошкі разумець такое непрыняцце тэль-авіўцамі выгоды свайго геаграфічнага становішча, трэба разумець, якія думкі кіравалі габрэйскімі пасяленцамі на пачатку ХХ стагоддзя.

Бабруйцы і бярдзічаўцы, якія заснавалі горад, найменш успаміналі пра турыстычныя выгоды: ахопленыя адраджэнскім імпэтам, яны прыехалі на Зямлю Ізраілю будаваць новае жыццё, адрознае ад свайго еўрапейскага досведу, зусім не маючы на мэце бавіцца ў шэзлонгах ля мора.

Наогул кажучы, на пачатку ХХ стагоддзя горад не быў цэнтрам жыцця для габрэйскіх перасяленцаў: кібуц (сельскагаспадарчы кааператыў) было тое месца, дзе мусіў гадавацца новы габрэй, які ўмее і любіць працаваць на зямлі. У дадатак былыя жыхары беларускіх і сярэднеўкраінскіх мястэчкаў, роўнааддаленых ад усіх мораў, дык наогул не ведалі, як трэба з тым морам абыходзіцца, і будавалі першыя кварталы Тэль-Авіва на свой, мястэчковы, капыл.

### Ах, Тэль-Авіў, жамчужына ля мора!

Адзін з першых, хто спрычыніўся, каб Тэль-Авіў зрабіўся курортам, быў былы вучань валожынскай



ешывы, нацыянальны габрэйскі паэт Хаім Нахман Бялік.

У Тэль-Авіў ён прыбыў у 1924 г. пасля сваіх колькігадовых бадзянняў па свеце.

Дарэчы, у 1921 г. Хаім-Нахман Бялік звяртаўся да ўладаў Беларускай Народнай Рэспублікі, каб яны паспрыялі выезду ягонай сям'і з Турцыі: дзеля гэтага ён нават атрымаў бэнээраўскае грамадзянства.

У Тэль-Авіве Бяліка апанавала дваістае пачуццё. З аднаго боку, захапіў урачысты прыём: тэль-авіўцы яго ганаравалі як нацыянальнага паэта і нават пасялілі на вуліцы імя яго самога. Але ў нязграбным горадку Бялік вялікі аматар багемных зборняў не знайшоў ніводнай прыстойнай кавярні.

Захаваўся публіцыстычны артыкул Бяліка, дзе ён гнеўна ганьбіць Тэль-Авіў. «У горадзе няма простых вуліцаў, доўгіх праспектаў, якімі зазвычай ганарацца іншыя гарады, — пісаў Бялік. — Да таго ж, ёсць вялікая загана: з многіх вулак не відаць мора».

Далей Бялік параўнаў вітрыны тэльавіўскіх крамаў з вітрынамі «маленькага польскага мястэчка», якія былі, на ягоную думку, «вынікам безгустоўнасці работнікаў крамы, якія ставяць на вітрыны ўсёўсяляке, без хоць якога эстэтычнага пачуцця».

«Найвялікшай трагедыяй» у сваім артыкуле Бялік назваў адсутнасць у Тэль-Авіве сквераў.

Метафарычна, як усякі паэт, Бялік выказаўся пра адсутнасць азелянення: «Якая ж гаротная тая жанчына, якая ўжо ў маладосці губляе свае валасы». І хай вас не бянтэжыць, што Бялік параўноўвае Тэль-Авіў з кабетай, на іўрыце слова «Тэль-Авіў» — жаночага роду.

Далей Бялік ставіць перад тэльавіўцамі прыклад паўднёвай прыгажуні Адэсы: з мноствам бульвараў і ўтульных сквераў, дзе дамы стаяць на даволі вялікай адлегласці адзін ад аднаго. Рэч у тым, што кінуўшы валожынскую ешыву, Бялік большасць свайго дарослага жыцця пражыў у «жамчужыне ля мора». І Тэль-Авіў будучыні яму бачыўся падобным менавіта да Адэсы.

З лёгкай рукі Бяліка Тэль-Авіў пачаў мяняцца: да капіявання пацёмкінскіх сходаў справа, праўда, не дайшла, але былі зробленыя выхады да мора, усталяваныя шапікі, праваобразы кавярняў, дзе можна было купіць газету і замовіць кавы. З'явіліся бульвары на адэскі манер.

Пасля 1921 году было пабудаванае першае казіно, і дзеля яго галоўная вуліца Аленбі была паступова перанакіраваная ў бок мора.

У 1924 г. адчыніўся першы пляж з душавымі. Пачалася пасадка платанаў на амаль шэрых датуль алеях. У 1936 г. з'явіўся порт, а ў 1940-я — месца для шпацыру ўздоўж пляжу.

Нам, цяперашнім, можа, падасца, што адзін паэт не здольны памяняць аблічча гораду, але не забываемся, што для габрэйскіх пасяленцаў Бялік быў маральным аўтарытэтам, а таксама меў вялікі ўплыў на габрэйскую супольнасць і ў шмат якіх іншых сферах жыцця.

У дадатак на пачатку ХХ стагоддзя, у часы нацыянальнага абуджэння, з вядомымі паэтамі раіліся не толькі ў літаратурных пытаннях. Па-трэцяе, не забудзем іншых уплывовых ураджэнцаў Адэсы, што тады жылі ў Тэль-Авіве: Меіра Дызенгофа, першага мэра, вядомага палітыка Уладзіміра Жабатынскага — усе яны таксама часцяком публічна прызнаваліся ў сваім замілаванні да Адэсы і яе архітэктуры.

### Маленькі Берлін...

Ад 1930-х гадоў пачаўся нямецкі перыяд у жыцці гораду — прыехала вялікая хваля эміграцыі з Нямеччыны. Пакручасныя вулкі былі выпрастаныя, а архітэктары, выхадцы з Германіі, пачалі будаваць дамы ў мадэрновым стылі «Баўхаўс» і канструктывізму.

Да 1920-х гадоў у Тэль-Авіве працавалі толькі арабскія кавярні. Неўзабаве ўздоўж галоўных вуліцаў і бульвару Ротшыльда адчыніліся звыклыя еўрапейскаму воку, з машынамі для гатавання эспрэса і барнай стойкай, кафэ. Як тады няўхвальна казалі мясцовыя сацыялісты і камуністы — у «буржуазным стылі». Пакідаючы пустыні і багны Блізкага Усходу знадворку, пад іх дашачкі прыходзілі Абрагам Шлёнскі, Аляксандр Пэн і, уласна, Бялік, а таксама іх шанавальнікі ці проста гарадскія абібокі. Пачаліся заўсёдныя багемныя медытацыі з цыгарэтай у адной руцэ і з кубачкам сто разоў астылай кавы ў другой. Тэль-авіўскія кавярні пакрысе зрабіліся цэнтрам жыцця: тут віравалі плёткі і скандалы, пераказваліся палітычныя навіны, а таксама прымаліся важныя рашэнні.

### ... і Нью-Ёрк

Цяпер у Тэль-Авіве вядзецца зболышага, як прадказваў Бялік. З аднаго боку, горад па-ранейшаму пакутуе на невыводную, неймаверную цеснасць: заціснуты з усіх бакоў гарадамі-спадарожнікамі, ён расце толькі за кошт ушчыльнення насельніцтва. У адной гумарыстычнай ізраільскай перадачы распавядаецца пра жыццё трох тэльавіўскіх студэнтаў, якія здымаюць адну кухню на траіх, кладучыся спаць у кухонных шафках і ў лядоўні.

У дадатак тэль-авіўцы мусяць змірыцца, што іх горад не самы чысты ў Ізраілі. Але з іншага боку, Тэль-Авіў зрабіўся вядомым курортам, слушным месцам для пакупкі моднай вопраткі, ювелірных вырабаў і далікатэсаў. Горадам-заканадаўцам тэатральнай моды. Тысячы турыстаў шпацыруюць па вуліцах, якія носяць імёны «адэскіх мудрацоў»: Бяліка, Жабатынскага і Дызенгофа.

У іўрыце нават з'явіўся дзеяслоў «легіздангеф» — перакласці на беларускую можна як «прадзэінгофіцца», няспешна прайсціся па вуліцы Дызенгоф, зазіраючы ў вітрыны, сябе паказаць і людзей паглядзець.



Цяпер цэнтр Тэль-Авіва параўноўваюць з цэнтрам Нью-Ёрку. Ён наводнены непрызнанымі геніямі: акторамі-пачаткоўцамі і канцэптуальнымі мастакамі, што ўвечары працуюць афіцыянтамі, абслугоўваючы больш паспяховых сваіх калегаў, каб удзень схадзіць на праслухоўванне або ў мастацкую майстроўню, цярпліва чакаючы свайго шанцу праславіцца. Як толькі ні называюць самі сабе насельнікі тэльавіўскіх кавярняў: «Пакаленне Капульскі» (паводле вядомага кавярні, дзе ўпадабалі збірацца літараты), «пакаленне эспрэса». А сваё багемнае, адарванае ад блізкаўсходняй рэчаіснасці, існаванне ў Тэль-Авіве самі ж мастакі і літаратары параўноўваюць з булдырком паветра, у які не пратачаецца трывожная рэальнасць, але разам з тым, той булдырок — з тонкімі сценкамі.

### Ахвяры іміджу: «Белавія» і сэкс-шопы

А яшчэ Тэль-Авіў — сталіца начнога жыцця: шматлікія дыскатэкі і клубы.

У канцы 1990-х да росквіту тэльавіўскіх гей-клубаў прыклалася транссэксуалка Дана Інтэрнэшнл, што перамагла на «Еўрабачанні». Ад іміджу начной сталіцы Ізраілю пацярпела нават беларуская авіякампанія «Белавія». У канцы 1990-х артадаксальны габрэй, пэўна, не вытрымаўшы лішку колькасці сэкс-шопаў і дыскатэк на душу гарадскога насельніцтва, шпурнуў бутэльку з кактэйлем Молатава ў вітрыну сэкс-шопу на вуліцы Бэн-Егуда. Агонь шпарка пашырыўся да з'еў прылеглыя крамы і офісы, у тым ліку тэль-авіўскае прадстаўніцтва «Белавія», якое месцілася непадалёк.

Паводле газеты «Ідыёт Ахранот», Тэль-Авіў зрабіўся горадам з «перадазіроўкай культуры і мастацтва», цынічным, хоць не зласмешным мегаполісам, што самастойна прыклаўся да стварэння ўласнага міфу і іміджу. Гэтае места, якое заўсёды хацела выглядаць «не раўнуючы як замежны горад»: «не Адэса, як Берлін, як Нью-Ёрк, і, можа, таму якраз дзякуючы гэтаму для любога замежніка яно цяпер выглядае адметна і непаўторна, «не раўнуючы як Тэль-Авіў».

**П.С.** Згубныя чары Тэль-Авіва прымусілі трохі загаварыцца нават ізраільскага прэзідэнта Шымона Перэса. 4 красавіка перад публікай, якая сабралася святкаваць 100-гадовы юбілей Тэль-Авіва, прэзідэнт сказаў літаральна наступнае: «хоць сталеў я ў Ерусаліме, але рос у Тэль-Авіве».

Мы ж ведаем, у якім Тэль-Авіве рос Шымон Перэс: у тым Тэль-Авіве, што знаходзіцца ў Мінскай вобласці Валожынскага раёну і які называецца мястэчка Вішнева.

## КАНЦЭРТЫ

**Беларускія песні Вайханскіх**

У межах культурніцкай кампаніі «Будзьма» **12 мая (аўторак) на мінскай сядзібе ТБМ (вул. Румянцава,13)** адбудзецца творчая сустрэча са знакамітым бардаўскім дуэтам Галінай і Барысам Вайханскімі. У выкананні бардаў прагучаць песні з беларускага альбому «Вяртанне». У сустрэчы прыме ўдзел вядомы паэт і фотамастак Георгій Ліхтаровіч. **Пачатак а 19-й**, уваход вольны.

**Аўтарская праграма Юрыя Несцярэнкі**

**14 мая (чацвер) у зале Тэатру рускага рамансу (вул. Чыгуначная, д. 27, корп. 2)** іграе Юры Несцярэнка (лідэр гуртоў «White Night Blues», «Nestary Band»). Аўтарская праграма, а таксама вядомыя творы з класікі блюзу і рок-н-ролу. **Пачатак у 19.00.** Квіткі 15 000. Даведка і замова квіткоў праз т.: (029) 692-06-01.

**Стары Ольса ў Гродне, Брэсце і Астрамечаве**

**14 мая а 19-й у гродзенскім тэатры лялек** адбудзецца сольны канцэрт «Старога Ольсы», **15 мая** «Стары Ольса» выступае **ў брэсцкім тэатры драмы і музыкі (вул.Леніна, 21). Пачатак а 19-й. 16 мая ў Астрамечаве (Брэсцкі раён)** — канцэрт «Старога Ольсы». Даведкі: (029) 324-52-40 (Кацярына).

## ІМПРЭЗЫ

**Прэзентацыя біяграфічнага альманаху «Асоба і час»**

Прэзентацыя беларускага біяграфічнага альманаху «Асоба і час. Выпуск 1» пройдзе **11 траўня (панядзелак) у «Гістарычнай майстэрні» (вул. Сухая, 25). Пачатак у 17:30.** Удзел бяруць Аляксандр Фядута, Сямён Букчын, Вольга Гарбачова, Віталь Скалабан, Міхась Скобла, Сяргей Шапран. Чакаецца таксама ўдзел сваякоў і родных тых людзей, пра каго распавядаецца ў зборніку.

**Эксперыментальны тэатр з Любліна**

**З 12 да 14 мая на сцэне Тэатра-студыі імя Еўсцігнея Міровіча (Акадэмія мастацтваў)** адбудзецца прэзентацыя еўрапейскага эксперыментальнага тэатру з Любліна (Польшча) «Пластычная сцэна кул». У рамках імпрэзы **12 мая ў Музеі сучаснага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47)** адчыніцца выстава плакатаў Лешака Мандзіка. **Пачатак а 17-й.** Уваход вольны. **У той самы дзень на сцэне Тэатру-студыі (пр.Незалежнасці, 81)** — прэзентацыя спектаклю «Вільготнасць». Уваход вольны. **Пачатак а 19-й і ў 20.30. 13 мая ў Тэатры-студыі а 17-й** — творчая сустрэча з Лешакам Мондзікам (уваход вольны). **А 19-й** — прэзентацыя спектаклю «Баразна». **(Уваход з вул.Сурганава ў дворык Акадэміі мастацтваў**, дзе адбудзецца спектакль).

**Такешы Кітана**

**З 11 мая да 21 чэрвеня ў відэакомплексе «Цэнтр-відэа» (пл.Незалежнасці, ТЦ «Сталіца», ніжні ўзровень)** у рамках праекту «Адкрыты фармат» адбудзецца рэтраспектыва фільмаў Такешы Кітана. Гледачу будзе пададзеная магчымасць убачыць шэсць карцінаў вядомага японскага рэжысёра ад камедыі да самурайскага баевіка — «Сцэны ля мора», «Зняў каго-небудзь», «Феерверк», «Кукіджыра», «Затоічы», «Такешыз». Т.: (029) 307-09-71.

**Мяльгуй і Мартыненка ў Віцебску**

**16 мая ў Віцебску ў музычнай гасцёўні (пр.Фрунзе, 11)** фан-клуб беларускай музыкі «Будзьма свабоднымі» запрашае на сустрэчу з аўтарамі кнігі «222 альбомы беларускага року» Віталём Мартыненкам і Анатолем Мельгуём. У межах сустрэчы пройдзе канцэрт Андрэя Плясанава, лідэра гурту P.L.A.N. **Пачатак у 18.00.** Уваход вольны. Даведкі: (029) 649-08-88.

## ВЫСТАВЫ

**Раманюк у Лондане**

**9 траўня ў 14.00 у Лондане** адбудзецца выстава вядомага беларускага фатографа Дзяніса Раманюка. Яна называецца «Сумная прыгажосць» і прысвечаная чарговым угодкам чарнобыльскай трагедыі. Фотаздымкі, што будуць паказаныя, зробленыя нядаўна ў забароненай зоне. Прэзентацыя будзе весціся на беларускай мове з перакладам на англійскую. **А 16-й** Вера Рыч з сябрамі прэзентуюць свой мультымедыйны перформанс «Wormwood Star» («Зорка палын»). Гэты перформанс быў зроблены адмыслова да дваццацігоддзя чарнобыльскай катастрофы ў 2006 годзе. Затым **да 17.30** будзе магчымасць задаць пытанні і разгледзець фотаздымкі. Падчас мерапрыемства будуць падавацца напоі і лёгкія закускі. Просьба пакідаць унёскі ў памеры 5 фунтаў дзеля кампенсацыі расходаў. **Як дабрацца: станцыя метро Holland Park (Central Line) або станцыя Notting Hill Gate (Central, Circle and District lines); аўтобусамі 31, 94, 148, 228.**

**Паводле zbsb.org**

**Свет Станіслава Манюшкі**

**У інфармацыйна-выставачным цэнтры ЦНБ НАН Беларусі (вул.Сурганава, 15, 1 паверх, пак.110)** працуе выстава «Музычны свет Станіслава Манюшкі», прымеркаваная да 190-годдзя з дня нараджэння кампазітара.

**6MOD: серыя [EXIT]**

**У PhotoGaller'эі ZHЯТА (к-р «Цэнтральны») да 16 мая** працуе выстава [EXIT] — першая серыя фотапраекту «6MOD» маладога фатографа Сняжаны Барценевай (Мінск). Уваход вольны.

**«Дзівосны Бог у святых сваіх»**

Выстава сучасных беларускай і польскай іканапісных школаў «Дзівосны Бог у святых сваіх» працуе **да 11 мая ў музеі гісторыі і культуры**. На выставе дэманструецца больш за 30 абразоў, створаных Сяргеем Каркатадзе (Брэст), Сяргеем Бышневым (Віцебск), матушкай Вольгай Дарашэвіч, Вольгай Чарняк, Паўлам Жаравым, Аляксандрам і Міхаілам Зубовічамі (Мінск) і іншымі. Дэманструецца таксама абраз XVIII стагоддзя «Хрышчэнне» з фондаў музею.

**«Кароткія гісторыі»**

**У мастацкай галерэі твораў Л. Шчамялёва (пр. Ракасоўскага, 49) да 15 мая** працуе выстава жывапісу Пітара Хіксана «Кароткія гісторыі».

## ТЭАТРЫ

### 7 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Балада пра каханне» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Вольга»
**Тэатр імя Горкага** — «Мнімы хворы»
**Тэатр юнага гледача** — «Сіні аўтамабіль»

### 8 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Адчыніце кантралёру!» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «КІМ»
**Тэатр імя Горкага** — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці»
**Музычны тэатр** — «Нябесны ціхаход»

### 10 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Музычны тэатр** — «Залатое кураня»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Музычны тэатр** — «Небесны ціхаход»
**Тэатр імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»

### 11 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Сны аб Беларусі»

### 12 мая

**Музычны тэатр** — «Небесны ціхаход»

### 13 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Дамскае танга» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

### 14 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Беларусь у фантастычных апавяданнях» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце лепш»
**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

### 15 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце лепш»
**Музычны тэатр** — Юбілейны вечар народнай артысткі Беларусі Наталлі Гайда
**Тэатр оперы і балету** — «Бахчысарайскі фантан»

### 16 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Старамодная камедыя» (Малая сцэна)
**Купалаўскі тэатр** — «Ідылія»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр юнага гледача** — «Каралеўства крывых люстэркаў»
**Музычны тэатр** — «Даратэя»
**Тэатр оперы і балету** — «Кармэн»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

### 17 мая

**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Тэатр оперы і балету** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Музычны тэатр** — «Баль кветак. Класіка і сучаснасць»
**Тэатр оперы і балету** — «Шчаўкунок»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Вы звяры, панове...

**«Людзі X: Расамаха»**
ЗША — Новая Зеландыя — Аўстралія, 2009, каляровы, 120 хв.
**Рэжысёр:** Гэвін Гуд
**Ролі выконваюць:** Х'ю Джэкман, Ліў Шрайбер, Раян Рэйнальдс, Барнэл Бохаск, Сілвэр Фокс, Дэні Х'юстан
**Жанр:** Комікс-баявік
**Адзнака:** 6 (з 10)

У далёкім XIX стагоддзі падлетак Логан (ён жа Расамаха) забіў кіпцюрамі ўласнага бацьку. З таго часу ён і ягоны брат Віктар (Шаблязубы) — разам ва ўсіх вайсковых канфліктах. Але пасля таго, як у В'етнаме вайры, сп'янелыя ад крыві, пачалі забіваць і сваіх, братоў расстралялі (беспаспяхова). З таго часу лёс мутантаў змяніўся: хітры палкоўнік Страйкер прапанаваў ім таемна працаваць на ўрад. Шаблязубы знайшоў асалоду ў злачынных акцыях, а Расамаха вырашыў адысці ад карніцкіх справаў. Але звярынае мінулае так проста не адпускае...

Комікесная карціна Гэвіна Гуда прадказальная, як гамбургер у супермаркеце. Ашаламляльныя бойкі з кіпцюрамі, скокамі, верталётам, балет з шаблямі — і вочы, што спапяляюць. Страляніна — і спыненыя кулі, лабараторыя падступных вайскоўцаў — і гнюсныя эксперыменты.

Такія стужкі глядзяць не дзеля навізны. Заўзятары шукаюць у фільме старых герояў. Гамбіт — карцёжны махляр з чароўнымі здольнасцямі, мутанціха Фрост з дыямантава-ледзяной скурай.

Але праграмаваную стужку можна прачытаць і нясумна. Ліў Шрайбер (Шаблязубы) намякае на подзвігі іншага свайго героя — Бельскага, які партызаніў у беларускіх лясах і таксама не вылучаўся вытанчанымі манерамі. (Так і бачыш брацікаў-мутантаў на падрыве цягнікоў!) Х'ю Джэкман — канадскі змагар з амерыканскім імперыялізмам. А пра ўсіх мутантаў казала яшчэ адна недабітая кінагераіня: «Вы звяры, панове...»

**Андрэй Расінскі**


# Пытайцеся часопіс ARCHE цяпер і ў паштовых аддзяленнях



# Як БТ Зінаіду Бандарэнка павіншавала

**Пад віншаваннем народнай артыстцы, якая аддала тэлебачанню з сорак гадоў, не падпісаўся ніводны кіраўнік Белдзяржтэлерадыёкампаніі.**

Сваё 70-годдзе народная артыстка Зінаіда Бандарэнка адзначыла 25 красавіка, віншаванне ж ад Белтэлерадыёкампаніі атрымала праз два дні. Яно ўяўляе сабой няроўна абрэзаны аркушык паперы з стандартным віншавальным тэкстам. Замест подпісу — безаблічнае «Савет ветэранаў Белдзяржтэлерадыёкампаніі».

«Я магу зразумець такое стаўленне асабіста да мяне, бо свядома абрала іншы бок, але мне крыўдна за ветэранаў тэлебачання, якіх такім чынам віншуюць». Спадарыня Зінаіда прыгадала 2006 год, калі Беларускае тэлебачанне адзначала 50-годдзе. На творчую вечарыну ў Палац Рэспублікі не запрасілі не толькі яе, але і некаторых іншых ветэранаў БТ, якія ўсяго толькі мелі адрозныя ад сучасных супрацоўнікаў дзяржаўнага тэлебачання погляды.

«Затое мяне цудоўна павіншавалі незалежныя СМІ. Мне потым з усёй краіны тэлефанавалі, віншавалі», — кажа Зінаіда Бандарэнка.

**СП**



СЯМЁН ПЕЧАНКА

КАЛЯНДАР

## Май

**1** — Свята працы.
**3** — Міжнародны дзень свабоды друку.
**9** — Дзень Перамогі над фашызмам.
**11** — Дзень святога Кірылы Тураўскага.
**15** — 100 гадоў з дня нараджэння (1909) вядомага заходнебеларускага выдаўца, рэдактара Язэпа Найдзюка, які быў дырэктарам друкарні імя Скарыны ў Вільні.
**17** — 75 гадоў таму (1934) па справе «Беларускага нацыянальнага цэнтру» быў расстраляны палітычны дзеяч і педагог, першы дырэктар Віленскай беларускай гімназіі, колішні дэпутат польскага сейму Міхаіл Кахановіч.
**24** — Дзень славянскага пісьменства, вядомы таксама як Дзень Кірыла і Мефодыя, што адзначаецца ў гонар балгарскіх манахаў, стваральнікаў славянскай азбукі.
**30** — 10 гадоў таму (1999) ў часе піўнога свята адбылася трагедыя на станцыі метро «Няміга». У цісканіне загінула 53 чалавекі, пераважна дзяўчаты-падлеткі.
**31** — Дзень народзінаў Буды (563 гадоў да н.э.).

**Уклаў ЛК**

# «Белсат»: тэлепраграма на 11—17 мая
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 11 мая, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял: 27 серыя
**18.55** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Усяслаў Чарадзей» (спазнаваўчая праграма)
**19.05** «Святаслаў Фёдараў — жыццё пасля смерці», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2006 г., Беларусь, ч. 2: «Летуценнік»
**19.35** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20.05** Невядомая Беларусь: «Праўда Хатыні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**20.40** «Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў», 8 серыя: «Азербайджан»
*Нядаўна Еўрапейскі Звяз з ініцыятывы Польшчы і Швецыі прыняў праграму «Усходняе партнёрства» для актывізацыі эканамічнай супрацы з групаю абраных краінаў, у тым ліку з Азербайджанам. Еўрапейскія эксперты дзеляцца сваймі ўяўленнямі пра будучыню краіны на Каспійскім моры.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21.35** «Адна рука не пляскае», маст. фільм, рэж. Давід Ондржычэк, 2003 г., Чэхія.
**23.20** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 18 серыя
**00.05** Аб'ектыў (навіны)

### 12 мая, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 18 серыя
**18.55** «Край светлых мрояў», дак. фільм, рэж. Юрый Гарулёў, 2008 г., Польшча
**19.45** Кружэлка (сусветная музыка)
**20.20** Без рэтушы: «Тайны мірнага атаму», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**20.40** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Маю права (прававая праграма)
**21.35** Форум (ток-шоу): Без права на жыццё
**22.20** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.50** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**23.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 19 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 13 мая, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: IV сезон, 19 серыя
**18.55** «Без рэтушы»: «Чатыры сімвалы», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**19.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**19.35** «Апошні сезон», серыял: 2 серыя
**20.30** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Рэпартэр (тэлечасопіс)
**21.40** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Усяслаў Чарадзей» (спазнаваўчая праграма)
**21.50** «Развітанне, вяртанне…», псіхалагічная драма, рэж. Клод Лелюш, 1985 г., Францыя.
*Габрэйская сям'я ўцякае з Парыжу ад пераследу гестапа і хаваецца ў правінцыйным замку ў сваіх сяброў. Аднак на іх нехта даносіць немцам... Вайну перажыла толькі Саламэ. Яна хоча даведацца, хто ж быў здраднікам...*
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 14 мая, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Развітанне, вяртанне…», псіхалагічная драма, рэж. Клод Лелюш, 1985 г., Францыя.
**20.10** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.30** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** Дакументальная гадзіна: «Крыкуны», дак. фільм-канцэрт, рэж. Міка Ронкайнэн, 2003 г., Данія—Фінляндыя
**22.45** Беларусы ў Польшчы
**23.05** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 6 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 15 мая, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 6 серыя
**19.00** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**19.25** Маю права (прававая праграма)
**19.40** З архіву «Jazz Jamboree»: «Рэй Чарлз», ч. 2
**20.15** Рэпарцёр (тэлечасопіс)
**20.40** Кінастужка (агляд кінарынку)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**21.30** «Панна Ніхто», маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда, 1996 г., Польшча
**23.10** «Апошні сезон», серыял: 3 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 16 мая, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.15** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**18.40** «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь—Нямеччына—Фінляндыя—Францыя
*Востраў у цэнтры вялікага возера, дзе сярод кінутых вайскоўцамі ўмацаванняў, забытых могілак, пустых школаў і хатаў жывуць два апошнія жыхары некалі люднага паселішча — Клюня і Маці. Яны жывуць ва ўзаемнай варожасці. Адзін з іх беларус, а другі — фін.*
**19.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.10** «Бульбаны», мультсерыял
**20.20** «Добрыя мясціны», дак. фільм, рэж. Нэнсі Брант, 2006 г., Нямеччына
*Уявім, што на свеце ёсць горадзе Трабантаў, а ў ім — звычайны незвычайны дом. «Трабант» — марка ГДРаўскага аўтамабіля, таму, відаць, маецца на ўвазе горад Цвікаў, дзе гэтыя аўтамабілі вырабляліся. Спачатку ў доме давалі кватэры перадавікам сацвытворчасці, а калі дзве Нямеччыны злучыліся, частку кватэраў прадалі. Побач з ГДРаўцамі пасяліліся іншаземцы . Такія розныя насельнікі ў такіх аднолькавых памяшканнях...*
**20.35** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Розныя светы», дак. фільм, рэж. Марка Шкоп, 2005 г., Славакія
**22.35** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**23.00** Суботні сеанс: «Нехта назірае», трымценнік, рэж. Даглас Джэксан, 2000 г., Канада.
*За год да таго, як у доме пасялілася лекар Мішэль з сынам , там адбылося страшэннае забойства. Мішэль, якая не ведала пра трагедыю, пачынае адчуваць, куды б яна ў доме ні пайшла, за ёю нібы нехта назірае...*
**00.30** Аб'ектыў (навіны)

### 17 мая, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**18.15** «Ранча», серыял: 28 серыя




**19.05** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**19.35** «Святаслаў Фёдараў — жыццё пасля смерці», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2006 г., Беларусь, ч. 3: «Змагар»
*У трэцяй частцы аўтары паказваюць, як Святаслаў Фёдараў удзельнічаў у выбарах прэзідэнта Расіі і змагаўся за ўласную клініку.*
**20.05** Форум (ток-шоу): Шлюб па разліку
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Давыд Гарадзенскі» (спазнаваўчая праграма)
*Яго імя абляцела ўсю Еўропу. І калі па адзін бок мяжы яго называлі шчытом і апошняю надзеяй дзяржавы, то па другі — чалавекам, які прадаў душу д'яблу. Факт, што за сваё жыццё славуты літвін не зведаў ніводнай хваробы.*
**21.25** «Акно ў Еўропу»
*Мэта праграмы — даць жыхарам Беларусі доступ да незалежнай інфармацыі пра падзеі ў іхняй краіне і ў дзяржавах Еўрапейскага Звязу, спрыяць дэмакратызацыі, захаванню правоў чалавека і развіццю грамадзянскай супольнасці.*
**21.55** Фільматэка майстроў: «Дом дурняў», драма, рэж. Андрэй Канчалоўскі, 2002 г., Расія.
*Дзесьці ў Чэчэніі непадалёк ад чыгункі стаіць агароджаны плотам дом — звычайная раённая клініка для псіхічнахворых. Раптам знікае доктар Ільіч, хворыя застаюцца без нагляду. Свабода! Але ў гэты момант у двор урываюцца баевікі...*
**23.40** «Права быць свабодным» — канцэрт альтэрнатыўнай музыкі на фестывалі «Be Free—2008», ч. 2: выступ гурта «Neuro Dubel»
**00.05** Аб'ектыў

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Які такі Бандэрас?

**Уразілі прававыя санкцыі за некарэктную трактоўку гісторыі другой сусветнай вайны, якія ўводзяцца ў Расіі. Фельетон Лёліка Ушкіна.**

Пры канцы красавіка група дэпутатаў расійскай Думы патрабавала ўвесці крымінальную адказнасць за праслаўленне дзейнасці антысавецкіх і пранацысцкіх арганізацыяў, якія дзейнічалі на тэрыторыі былога СССР у часы другой сусветнай. Пад закон пападаюць нават замежныя ўрады. З тымі, хто праслаўляе, будуць на фіг разрываць дыпламатычныя зносіны.

Цяжка сказаць, як урад Пуціна будзе рэалізоўваць свае ініцыятывы. Бо першы, каму свеціць тэрмін за парушэнне гэтай нормы — прэзідэнт Расіі Дзмітры Мядзведзеў. Не так даўно ён паклаў кветкі на магілу фінскага маршала Густава Манергейма. Таго самага, што трымаў супраць Чырвонай арміі два франты. І, самае крыўднае, — паспяхова.

Але то Мядзведзеў. А вам, калі вы нават проста фанат кінаактора Антоніо Бандэраса, у Расіі раю не выказваць на публіцы захаплення талентам свайго куміра. Раптам ім там падасца, што Бандэрас — гэта правадыр Украінскай Паўстанцкай Арміі Сцяпан Бандэра, ды яшчэ з балтыйскім канчаткам? Плакаў тады наш тавараазварот.

А ў прынцыпе было б файна, каб расійскія палітыкі і далей працягвалі радаваць падобнымі прававымі актамі. Напрыклад, увялі адказнасць за адмаўленне вядучай ролі ураду Пуціна ў перамозе над сусветным фінансавым крызісам. І прэміі — за пацверджанне гэтай ролі. Мы б, увогуле, азалаціліся.

МЫ САМІ

## Журналісты «НН» другі год запар перамагаюць у конкурсе «Вольнае слова»

**Журы творчага конкурсу Беларускай асацыяцыі журналістаў назвала найлепшых за 2008 год.**

Сярод іх — два аўтары «НН». У намінацыі «Найлепшая аналітычная публікацыя» перамагла рэцэнзія «Камедыя выраджэння» **Аляксандра Фядуты** на купалаўскую пастаноўку Мікалая Пінігіна «Пінская шляхта» па аднайменным творы В. Дуніна-Марцінкевіча. У намінацыі «Найлепшая публікацыя літаратурна-мастацкага жанру ў журналістыцы» першае месца ўзяў нарыс «Аднагодак БНР» **Сямёна Печанко**.

Прыемна, што аўтары «НН» сярод пераможцаў — другі год запар. У 2007 г. Віталь Тарас быў прызнаны аўтарам найлепшае аналітычнае публікацыі, Сямён Печанко — літаратурна-мастацкае, а Зміцер Панкавец — найлепшым дэбютантам.

«Вольнае слова» — своеасаблівая Пулітцэрская прэмія беларускай незалежнай журналістыкі.

**МБ**

АЎГУСЦЕЙШАЯ СЯМ'Я

# Забавы Колі ў Ватыкане

**Папа Бенедыкт XVI прыняў 27 красавіка ў Ватыкане Аляксандра Лукашэнку. Асабістая аўдыенцыя працягвалася 25 хвілін. Упершыню ў гісторыі Святога Пасаду ў сустрэчы ўзяў удзел і малодшы сын кіраўніка дзяржавы Мікалай.**



**У Апостальскім палацы цяпер гуляюць у футбол.**



**У свіце Лукашэнак зноў невядомая журналістам бландынка.**

ЖАРТЫ

Пральная машына катэгарычна адмовілася ехаць з крамы ў сям'ю, дзе нарадзілася тройня. Калі яе прывезлі туды сілком, яна на знак пратэсту распраграмавалася і перагарэла.

***

Калі вы змаглі прымусіць сябе перастаць лузгаць семкі, калі іх засталося яшчэ паўкулька, пераадолець гераінавую залежнасць вы здолееце ўвогуле без напругі.

***

Калі б старажытныя рабаўладальнікі зазірнулі ў будучыню і пабачылі, як працуе іпатэка, яны пачалі б адпускаць сваіх рабоў у крэдыт.

***

На шашы, дзе хуткасць абмежаваная да 60, міліцыянер спыняе старую іржавую машыну.

— Вы аштрафаваныя, — тлумачыць ён кіроўцу. — Вы ехалі 72!

— Даруйце, а не маглі б вы напісаць у пратаколе, што хуткасць была 120? Я хачу машыну прадаць чым даражэй.

«НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Гарадок, Вілейскага пав., Віленскай губ.** Паехала ўдава Антуковічыха пазычаць грошы ў банку і ўзяла з сабой паручыцеляў, а як дала ім добра гарэлкі, дык аднаго прывезла дахаты ўжо нежывога. Кажуць, як яна садзіла іх на воз, дык кожнаму падвязала хусткай пад бараду шапкі, каб не згубілі. Ці хусткі тыя былі туга заціснутыя, ці што — толькі прывезла дамоў нябожчыка.

**«Наша Ніва». №17. 1909**

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІТАННІ

**Віншуем Змітра Вайцюшкевіча** з нараджэннем другога сына. Аршанцы

**1 траўня Алесю Каліту споўнілася 25 гадоў!** Моладзь БНФ сардэчна віншуе Алеся з юбілеем. Няхай час праляціць вельмі хутка, моцы і нязломнасці духу! Вясновага настрою. Дзембель хутка!

СПАЧУВАННІ

**Выказваем шчырыя спачуванні сп. Юрыю Беленькаму** ў сувязі з ягоным горам — смерцю маці. Сябры Беларускага руху, Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне» і КХП–БНФ

**Сябры «Вясны» выказваюць глыбокае і шчырае спачуванне** Старшыні РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт», калегу і партнёру Алегу Гулаку і яго блізкім у сувязі з ягоным горам — смерцю маці

**Прайшло сорак дзён, як пакінуў гэты свет Мікола Пагодзін,** арганізатар і кіраўнік Жлобінскай суполкі БНФ. Папрацаваўшы ў гандлёвым флоце, пабачыўшы свет, ён вельмі любіў сваю радзіму і вельмі хацеў яе дабрабыту. З любімай жонкай ён даў жыццё траім дзеткам, пабудаваў добрую хату і пасадзіў добры сад. Карыстаўся павагай не толькі сяброў і паплечнікаў, але і тых, хто з шаленствам і здзекам калі-нікалі вымаўлялі – нацыяналіст! Любіў радзіму, жыццё, і такім ён застанецца у памяці удзячных яму за гэта людзей. Сябры з АГП, ПКБ, БНФ

ПАДСЛУХАНА

### Як адрозніць праваслаўную царкву ад каталіцкай

Мінск, плошча Свабоды, гутараць двое маладых людзей, юнак і дзяўчына. Юнак тлумачыць спадарожніцы:

«Калі ў царкве знутры ўсё так багата — значыць, праваслаўная...»

### Вуліца, ліхтар, аптэка...

Вуліца Маркса, аптэкі розныя, крамкі, непазбежная метастаза чагосьці там «...пры прэзідэнце РБ», філіял БДУ і іншае такога ж гандлёвага і адміністратыўнага кшталту. Студэнты, алкаголікі, дарожныя рабочыя, чыноўнікі – усе вельмі дзелавітыя. Гукі таропкага цэнтру гораду.

Аднекуль з верхніх паверхаў нечакана, як снег на галаву — фартэпіянны эцюд. Дзяўчына здзіўлена ўскідвае галаву да вокнаў:

— О! Ды тут і жыве хтосьці!

**community.livejournal.com/overheard_by**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Генадзевіч Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5715. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 05.05.2009.
Замова № 2397.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12